Тыднёвік Магілёўскі

№ 9 (50) 4 сакавіка 1999 г. Кошт свабодны

ПЕРАДСЬВЯТОЧНАЯ АНКЕТА

Чырвоны дзень як нагода для роздуму

АД РЭДАКЦЫІ. *Напярэдадні 8 сакавіка мы зьвярнуліся да знаёмых жанчын і дзяўчатаў з просьбай падзяліцца думкамі аб тым, што ёсьць для іх зараз Жаночае сьвята. Цяпер зь яго «выветрыўся» ранейшы ідэалягічны зьмест, але самое сьвята і яго ныя рытуалы (падарункі, кветкі, гаспадарчая дапамога з боку мужчынаў) засталіся. Вось як яны адказалі на нашае пытаньне.*

Людміла ЛЕЎЧАНКА, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Клімавіцкай сярэдняй школы:

– Дасюль жанчына лічыцца істотай нібы 2-га гатунку і з боку грамадзтва, і з боку нашых мужчынаў. Асабіста ў мяне 8 сакавіка, на шчасьце, амаль кожны дзень. А ўвогуле, я бачу і ведаю: жанчынам жывецца цяжка. Улада пра іх не клапоціцца. Яна не далучае жанчыну да працы на карысьць супольнасьці. І атрымліваецца, што ў нас жанчына збольшага знаходзіцца ў натуральнай апазыцыі да дзяржавы. Вядома, што ў жанчын нестандартнае мысленьне. Для ўлады гэта можа стацца вялікім плюсам, але пакуль менавіта гэта яе палохае. Паглядзіце на прэзыдэнта. Я лічу, што многія недарэчнасьці ў яго ных паводзінах ад таго, што побач няма жонкі. А вось каб Галіну Радзівонаўну абралі кіраваць Беларусьсю, яна б ад дапамогі мужа не адмовілася. Калі б пры высокіх пасадах у нас былі жанчыны, клімат у дзяржаве стаў бы цяплейшым.

У сёньняшні складаны час асабліва небясьпечна, каб жанчыны заставаліся выключна ля печаў. Яны павінны сёньня бараніць будучыню сваіх дзяцей. Павінны разам з мужамі адстойваць здаровы сэнс і розум. Праўда, на жаль, нямала ў нас такіх жанчынаў, што дапамагаюць рабіць дурное. Я асабіста ад гэтага вельмі пакутваю душой.

Вольга ФЁДАРАВА, студэнтка Рэгіянальнага цэнтру тэхнічнае адукацыі:

– Восьмае сакавіка – гэта сапраўды жаночае сьвята, але-ж ня толькі таму, што яно сьвяткуецца кожны год ды прысьвячаецца менавіта жанчынам, а яшчэ гэты дзень лічыцца адным зь першых дзён вясны. Можа быць, з гэтага моманту ўсё абуджаецца ад адзіноты, сну, і гаспадыня Вясна бярэ ўсе прыродныя справы ў свае рукі. Жанчыны вельмі чакаюць гэта веснавое сьвята. На мой погляд, у гэты дзень яны становяцца больш прыгожымі, жвавымі, жаданымі і, ўрэшце рэшт, каханымі. Таму трэба шанаваць гэтае сьвята й працягваць яго сьвяткаваць.

Аксана ВОЛКАВА, навучэнка Сьветлагорскага ліцэя, госьця Магілёва:

– Заглянем у гісторыю? Яшчэ ў Эгіпце восьмае сакавіка лічылася прафэсійным сьвятам, прабачце, жанчын, як мы цяпер гаворым, лёгкіх паводзінаў. Што тычыцца сёньняшняй Эўропы, дык такога сьвята ў якасьці міжнароднага там зусім няма. Пяшчота і павага да жанчын кампэнсуецца, напрыклад, Днём маці.

У нас, па традыцыі, ёсьць толькі тое, што ёсьць: сьвята 8 сакавіка. Якое-ніякое – а ўсё-ж нашае. Няхай яно, пакуль ня вынайдзем іншае, і застаецца.

РЭЙТЫНГ падзеяў за люты паводле «ТМ»

СТАНОЎЧЫЯ ПАДЗЕІ:

– Выхад на волю юнага палітвязьня Аляксея Шыдлоўскага

* * *

– Згода Міхаіла Чыгіра і Зянона Пазьняка на ўдзел у прэзыдэнцкіх травеньскіх выбарах

* * *

– Масавае шэсьце й мітынг у Менску супраць расейскага фашызму на Беларусі, арганізаваны праваабарончымі арганізацыямі

* * *

АДМОЎНЫЯ ПАДЗЕІ:

– Забарона з боку уладных структураў на адрас СМІ друкаваць інфармацыю, якае закранае тэму выбараў прэзыдэнта

* * *

– Значнае пагаршэньне сытуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, адзначанае ў штогадовым дакладзе Дзяржэпартамэнта ЗША

* * *

– Выключэньне студэнтаў Дзяніса Бобікава і Анатоля Брыціна з Горацкай сельгасакадэміі за грамадзкую актыўнасьць, якая не падабалася адміністрацыі навучальнае ўстановы

ГАРАЧАЯ НАВІНА

Захоп управы мясцовага Фронту

У аўторак вечарам у цёмным двары па Ленінскай вуліцы, у глыбіні якога стаіць састарэлы дом, дзе разьмяшчаецца ўправа гарадзкой арганізацыі БНФ, спынілася некалькі міліцэйскіх машынаў. Камандуючыя захопам памяшканьня ўправы маёры Цэнтральнага РАУС Ермакоў і Чумакоў у суправаджэньні ст. л. Панкова і ўзброеных сэржантаў, не пазіраючы на такія дробязі як тлумачэньне нагоды і мэты свайго нечаканага зьяўленьня, шпарка прыступілі да справы. На практыцы гэта азначала вобшук памяшканьня, у якім, па словах афіцэраў, захоўваецца «небясьпечная для дзяржавы літаратура». Міліцыянты сэржанцкага саставу тым часам спрабавалі перапісаць людзей, што знаходзіліся ў памяшканьні, па дарозе высьвятляючы, хто яны такія і якім чынам прысутнічаюць тут.

Перамовы зь міліцэйскімі сіламі вялі старшыня ўправы БНФ Анатоль Фёдараў і старшыня Праваабарончага цэнтру Валадар Цурпанаў, якога фронтаўцы напачатку акцыі выклікалі па тэлефоне ў якасьці сьведкі. Афіцэры склалі пратакол «изъятия» небясьпечных матэрыялаў, у лік якіх патрапілі дакумэнты арганізацыі, друкаваныя фронтаўскія ўлёткі і ўсе паперы, якія тым ці іншым чынам мелі адносіны да З. Пазьняка (старыя плякаты зь яго ным фота, артыкулы і да таго падобнае).

Невядома, што намерваліся засьпець міліцыянты ва ўправе, але, мяркуючы па спэцаўтобусе, што чакаў у двары, меркавалася «замясьціць» ўсіх, хто трапіць пад руку. Аднак перамовы з праваабаронцам пра законнасьць, складзены на вачах міліцыянтаў контр-пратакол, пад якім падпісаліся ўсе прысутныя ва ўправе людзі, пацяху астудзілі нечаканых гасьцей. Яны палічылі дастатковым забраць з сабой у пастарунак аднаго Анатоля Фёдарава, якога дабраахвотна пагадзіўся суправаджаць Валадар Цурпанаў. Лідэру мясцовага Фронта там і выпісалі позву ў суд, які адбыўся ўчора падчас вёрсткі газэты. Таму рэдакцыя мае магчымасьць толькі паведаміць пра яго ны вынік: Анатоль Фёдараў судзьдзёй Цэнтральнага раёна сп. Плотнікавай поўнасьцю апраўданы.

УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

ТЭМА НУМАРУ

Каму яшчэ не аб'явілі папярэджаньне

18 лютага прадстаўнік Цэнтравыбаркама па выбарах прэзыдэнта РБ, прызначаных Вярхоўным Саветам на 16 траўня, Сяргей Абадоўскі, быў выкліканы позвай ў мясцовае ўпраўленьне КГБ да ст.лейтэнанта Пічугіна. Чэкіст выказаў жаданьне правесьці зь ім гутарку. С.Абадоўскі абумовіў згоду да размовы прысутнасьцю падчас яе свайго прадстаўніка. Спасылкі на Канстытуцыю РБ ня мелі плёну – сп.Пічугін адмовіў у гэтым. У сваю чаргу С.Абадоўскі адмовіўся адказваць на пытаньні й штосьці падпісваць.

Цягам 15 хвілінаў ст.л-т Пічугін тлумачыў С.Абадоўскаму недапушчальнасьць й процiпраўнасьць ягонай дзейнасьці па падрыхтоўцы выбараў прэзыдэнта. Маўчаньне апытваемага, адмова падпісаць папярэджаньне вымусілі чэкіста зьвяртацца па кансультацыю да начальства. Пасьля візыты «наверх» сп.Пічугін перадаў С.Абадоўскаму тэкст папярэджаньня й забараніў скласьці акты аб парушэньнях правоў прадстаўніка Цэнтрвыбаркама непасрэдна ў будынку КГБ.

У гэты-ж дзень за друкаваньне матэрыялаў, што тым ці іншым чынам закранаді тэму выбараў прэзыдэнта, рэдакцыі нашае газэты, а таксама газэтам «Де-Факто», «Вечерний Могилев» і «Могилёвская правда» было вынесена афіцыйнае папярэджаньне абласной пракуратуры за подпісам А.Дудкіна, пракурора вобласьці. У ім ён пазначыў, што распаўсюд інфармацыі пра падрыхтоўку «досрочных» выбараў прэзыдэнта РБ «вступает в противоречие» з Канстытуцыяй і дзеючым заканадаўствам. Больш за тое, старэйшы дарадца юстыцыі сп.Дудкін папярэдзіў газэты аб магчымай адміністратыўнай і крымінальнай адказнасьці за арганізацыю і ўдзел у «подобных противоправных действиях».

«ТМ» ужо даводзіў сваю пазыцыю наконт «арганізацыі й удзелу» ў папярэднім нумары газэты. Паўторым яшчэ раз: **выбары рыхтуе Вярхоўны Савет.** Права, мэта й абавязак газэты – інфармаваць грамадзтва пра падзеі й факты ды аналізаваць іх. Па-сутнасьці, абласная пракуратура забараняе нам наогул узгадваць хоць штонебудзь пра пэўную падзею, а менавіта – падрыхтоўку прэзыдэнцкіх выбараў, бо лічыць самую інфармацыю аб гэтым парушэньнем заканадаўства. Пра якую-ж законнасьць ідзе гаворка?

Трэба адцеміць, аднак, што не на ўсіх распаўсюджваецца гэтая забарона. Напрыклад, у афіцыйнай газэце аблвыканкама «Магілёўскія Ведамасці» было надрукаванае паведамленьне аб папярэджаньні ўпраўленьня КГБ па Магілёўскай вобласьці Сяргею Абадоўскаму. У гэтым тэксьце былі падрабязна пералічаныя ўсе, на думку чэкістаў, незаконныя дзеяньні мясцовага каардынатара Цэнтрвыбаркама, пра што, у прыватнасьці, паведамлялася ў нашым артыкуле, які «ТМ» вымушаны быў 17 лютага зьняць з ужо падрыхтаванага нумару!

Як бачым, прэс-групе УКГБ у сваіх адкрытых зваротах да грамадзтва ўзгадваць пра падрыхтоўку выбараў можна, а іншым журналістам – нельга. Дык на чым-жа грунтуецца лёгіка паводзінаў пракуратуры й самога ўпраўленьня КГБ? І хто каму зь іх цяпер вынясе папярэджаньне?..

Валадар ЦУРПАНАЎ,
старшыня праўленьня магілёўскага Праваабарончага цэнтра

Віктар СУДНІК,
адказны сакратар рэдакцыі газэты «Тыднёвік Магілёўскі»

ПРАКУРАТУРА

17.02.99 № 22-02-99

В редакции газет "Могилевская правда", "Могилевские ведомости", "Де-факто", "Вечерний Могилев" и "Тыднёвик Магілеўскі "

ЗАЯВЛЕНИЕ
Прокуратуры Могилевской области

В последнее время в некоторых средствах массовой информации (газет "Де-факто", "Вечерний Могилев", "Могилевская правда", "Тыднёвік Магілеўскі ") под влиянием определенных политических сил распространяется информация о подготовке проведения досрочных выборов Президента Республики Беларусь.

Данное намерение вступает в противоречие с Конституцией Республики Беларусь и действующим законодательством.

Прокуратура Могилевской области предупреждает, что организация и участие в подобных противоправных действиях может повлечь за собой как административную, так и уголовную ответственность.

Прокурор Могилевской области
старший советник юстиции А.К.Дудкин

КРОНІКА ТЫДНЯ Ў ПАДЗЕЯХ І ФАКТАХ

Завяршылася кампанія па перапісу насельніцтва. Многія чытачы паведамілі нам, што скарысталіся папярэдне надрукаванымі ў газэце парадамі аб тым, як паводзіць сябе падчас візыты лічыльніка. Відаць, гэтыя парады прачытала і статыстычнае ўпраўленьне: на запатрабаваньні беларускамоўных анкетаў амаль ва ўсіх лічыльнікаў яны знайшліся. Хаця чытачы адзначылі і тое, што праяўленая імі «беларускасьць» сустракала ў большасьці перапісчыкаў зьдзіўленьне.

Скончыўся прапагандысцкі і асьветніцкі тыдзень, зьвязаны з наркаманіяй і СНІДам. Сёлета, на працягу няпоўных двух месяцаў ад пачатку года, колькасьць хворых на гэтую сьмяротна небясьпечную заразу павялічылася на 3 чалавекі. Такім чынам цяпер у нас 79 чалавек хворыя на СНІД. Складанай застаецца сытуацыя маладзёвай наркаманіі. Ледзь не адкрыта ўжываюць наркотыкі й іх заменьнікі школьнікі. Такія выпадкі адзначаныя, у прыватнасьці, у Крычаве.

Сваё 100-годзьдзе адзначыла нашая зямлячка Яўгенія Антончыкава. Яе павіншавала і ўлада. Юбіляршы былі выдзеленыя і ўручаны 4 мільёны рублёў.

З магілёўскага спэц-ПТВ №2, дзе ўтрымліваюцца непаўналетнія, але сур'ёзныя правапарушальнікі, зьбеглі двое ўтрыманцаў. Выпадак прызнаецца не такім ужо небясьпечным, калі прыгадаць, што летась адсюль зьбеглі адразу 40 падлеткаў.

Амаль удвая павялічыўся кошт праезду на прыгараднай чыгунцы. Доўгі час да задавальненьня грамадзянаў чыгунка была танней за аўтобус. Цяпер кошты падцягнуліся да аднаго ўзроўню. Асабліва гэтым заклапочаны тыя, хто жыве са сваіх гародных лецішчаў.

Інфармацыйная служба «ТМ»

Усе здымкі гэтага нумару – IREX Pro/Media

КРОНІКА ТЫДНЯ Ў ПАДЗЕЯХ І ФАКТАХ

Падмануць не атрымаецца

У нумары "Магілёўскіх ведамасцяў" за 23.02.99 г. начальнік упраўленьня арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама Ф.Лісовіч паведаміў чытачам, што «апазіцыйныя» партыі вылучаюць сваіх кандыдатаў у мясцовыя саветы.

Мусім заявіць, што гэта ня так. Партыі дэмакратычнага накірунку, як вядома, прынялі скаардынаванае рашэньне не прымаць удзелу ў мясцовых выбарах, вынікі якіх прадвызначаныя ўладай. Акцыя дэмакратаў зьвязаная таксама з тым, што новы Закон аб выбарах па цэламу шэрагу артыкулаў і палажэньняў ня можа лічыцца цывілізаваным. Гэта закон «аб выбарах» ва ўмовах дыктатуры.

Зразумела, што ўлада хацела б прадставіць выбары як дэмакратычнае волевыяўленьне насельніцтва. Аднак падмануць грамадзтва і міжнародную супольнасьць ня ўдасца.

Абласныя і гарадзкія арганізацыі партыяў дэмакратычнага накірунку.

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА
576 кгц – новая частата на сярэдніх хвалях!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА СВАБОДАЙ!

У праграме:
...навіны зь Беларусі і ўсяго сьвету, правы чалавека, апазыцыя, улада, родная мова, эканоміка, мэдыцына, культура, гісторыя, эміграцыя...

Спэцыяльныя перадачы:
...Праскі акцэнт, Вострая Брама, Чытальная Заля, Блізкая Эўропа, Неабжытая Спадчына, Сымбаль Веры, Беларускія раздарожжы, Адукацыя за мяжою, Новае пакаленьне выбірае, Беларускі інтэрнэт...

Новыя хвалі і частоты
18:00 – 19:30 6000, 6170, 7155, 9615 кгц (49,41,31м)
22:00 – 23:30 6010, 6025, 6170, 7155 кгц (49,41м)
06:00 – 07:00 5995, 7275, 7295, 9750 кгц (49,41,31м)
Перадачы можна слухаць на сярэдняй хвалі 576 кгц (521м)
ІНТЭРНЭТ: http://www.rferl.org/bd/be/belarus
Паштовы адрас: 220005, Менск-5, а/с 111•Vinohradska 1, 11000 Praha 1, Чэхія

Баісься астацца ад часу?
Слухай беларускую музыку!
Нашая музыка заўсёды наперадзе.
Распачнем адраджэньне нашае культуры з
НОВАЕ БЕЛАРУСКАЕ МУЗЫКІ...
Набыць (альбо замовіць) касэты можна ў нас:
Магілеўскае згуртаваньне моладзі
«Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу»
Тэл. 22-34-90 (панядзелак, серада, пятніца з 18:00 да 21:00)
альбо
25-57-85 Алесь (тэлефанаваць не пазьней 20:00).
Нашае згуртаваньне прапануе вам
сучасную беларускую літаратуру:
«Сьцяна» Васіля Быкава, творы Адама Глёбуса, Ларысы Геніюш, Сяргея Дубаўца і шмат іншых.
Набывайце й чытайце РОДНУЮ літаратуру!

Мала нам камісараў

Не пасьпелі ўвесьці на прадпрыемствах намесьнікаў дырэктараў «па выхаваўчай рабоце», як пачалі ўводзіць пасады «спэцыялістаў па працуючай моладзі».

Пiянэрам тут выступіў камуністычны Бабруйск. Гарвыканкам распарадзіўся ўводзіць на прадпрыемствах пасады аплочваемых чыноўнікаў па маладзёвых адносінах і праблемах. Засталася пакуль ня вызначанай сума акладаў і наогул сістэма аплаты «працы». Але за гэтым справа ня стане, была б ідэя.

Першае даручэньне новым спэцам – прыцягненьне моладзі да актыўнага ўдзелу ў маючых хутка адбыцца мясцовых выбарах. Ясна, што такую адказную задачу можна ўскласьці толькі на загартаваных і праверaных людзей. Таму гарвыканкам настойліва параіў дырэктарам шукаць на пасады маладзёвых спэцыялістаў выключна сябраў БПСМ. Баявы атрад лукашэнкаўскіх камсамольцаў ужо неадноічы засьведчыў сваю адданасьць правадыру. Есьць спадзеў на яго з боку «старэйшых таварышаў» і на гэты раз.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Дробязь, а прыемна

Затрыманых парушальнікаў мытных парадкаў у Касьцюковічах дастаўляюць зь мяжы ў райцэнтар на адмысловым аўтобусе.

Цяпер ня трэба самім «на перакладных» дабірацца з шашы або чыгуначнай станцыі да раймілiцыі за квітанцыяй на штраф і сваімі дакумэнтамі. Даставяць з камфортам!

Хутка, без залішняе бюракратычнае валакіты афармляюць, – і парушальнік можа быць вольным. Праўда, за дастаўку зь вінаватага бяруць грошы. Кошт праезду ў спэцаўтобусе сыціплы, не перавышае якіх-небудзь паўсотні тысячаў рублёў. Ці-ж параўнальныя гэтыя грошы з павагай, якую праявілі ў Касьцюковічах да тых, хто едзе ў Расею або вяртаецца зь яе...

Іван ЗАСАДА

Сямёнаў вяртаецца да справы?

Вядомы магілёўскі дырэктар, а потым бізнэсмэн Уладзімер Сямёнаў, магчыма, ачоліць сумеснае беларуска-партугальскае прадпрыемтсва «Сапатэкс». Нагадаем, што Сямёнава судзілі й далі тэрмін за службовыя і эканамічныя злоўжываньні, так і не перакапаўшы грамадзтва ў сапраўднасьці ягонае віны. Сумневы ў ёй падаграваліся тым, што ў магілёўскага дырэктара не склаліся адносіны з Лукашэнкам яшчэ падчас дэпутацтва будучага прэзыдэнта.

Згодна судовага выроку Сямёнаў ня можа займаць кіруючыя пасады ў дзяржаўных прадпрыемствах. Аднак нагадаем, што «Сапатэкс», на шчасьце, да іх не належыць. Як нам сталася вядомым, канчатковае рашэньне будзе прынятае на паседжаньні Рады праўленьня прадпрыемства. Гэткім чынам апальны бізнэсмэн ня склаў рукі, а поўны рашучае гатоўнасьці працягваць сваю вытворчую і прадпрымальніцкую дзейнасьць на тэрыторыі нашае краіны, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, у якія паставіла беларускіх бізнэсмэнаў сёньняшняя ўлада. Не гаворачы ўжо пра ўмовы, у якіх апынуўся сам былы дырэктар і былы вязень.

Алесь ДАЙНЕКА

Мы ўсё яшчэ ваюем...

Я не хачу падацца сьвятым. Я сам зьбіраўся падаць рапарт аб адпраўцы ў Афганістан. Доўгі час шкадаваў, што не атрымалася...

Пазаўчора большасьць мужчын адзначала «сваё» сьвята, замацаванае прэзыдэнцкім указам: Дзень абаронцы Айчыны (былы Дзень Савецкай Арміі). Адзначаецца гэтае «сьвята» павальным выпіваньнем па месцы працы, што ёсьць лепшым сьведчаньнем адсутнасьці ў гэтага дня духоўнага зьместу. А некалькі раней краіна «сьвяткавала» яшчэ адну ваенную дату – чарговую гадавіну вываду савецкіх войскаў з Афганістану. Менавіта сьвяткавала: урачыстымі паседжаньнямі, фэстывалямі песьні, застольнымі вечарынамі, вітальнымі прамовамі... Урачыстасьці мелі на ўвазе адцягнуць увагу ад роздуму, ад высноваў, ад пакаяннага маўчаньня з нагоды ахвяраў, прынесеных няведама дзеля чаго... На чым-жа будуецца сёньня афіцыйны падмурак «нашага патрыятызму»?

Пасьля зьнікненьня з мапы сьвету Савецкае імпэрыі наша рэспубліка дэкляравала сваю незалежнасьць. І выпрацоўка дактрыны нацыянальнае ідэалёгіі патрыятызму, здавалася, пакрыху пайшла. Ды толькі няшмат часу нацыянальныя каштоўнасьці мелі мажлівасьць здабываць сабе месца ў сьвядомасьці беларусаў. Саюз зьнік, аднак ягоны прывід застаўся. І адраджацца ён пачаў у Беларусі.

Савецкі патрыятызм меў выключна ваяўнічую афарбоўку, пры паўсюдным дэкляраваньні міралюбнасьці савецкіх людзей, савецкае дзяржавы... Першымі героямі, вартымі прыкладу, сталіся ўдзельнікі перавароту 1917-га года, тыя, што вынішчылі эліту тагачаснае Расеі ў пажары грамадзянскае вайны, забойцы царскае сям'і, рупліўцы «продразверсток» і г.д. Камуністы даволі ўдала выкарыстоўвалі ахвярнасьць нашых бацькоў, дзядоў у гады Другой сусьветнай вайны, у якой павінен Савецкі Саюз (Сталін) ня меней, мажліва, за Нямеччыну.

Але зь цягам часу патрыятызм удзельнікаў Вялікай Айчыннай страціў сваё ўзьдзеяньне на сьвядомасьць маладых. Тым болей, наколькі рэальна дзяржава цэніць сваіх абаронцаў. Таму прапагандысцкая машына запрацавала на ўвесь моц пасьля распачатай Савецкім Саюзам агрэсіі супраць афганскага народа.

Мы-ж прыйшлі ў чужую краіну й прынесьлі кроў і сьмерць. За маразм кіраўніцтва кампартыі расплачваліся нашыя хлопцы. І кошты мусілі заплаціць вялікія: 13 тысячаў забітымі, дзесяткі тысячаў параненых й калекаў. А хто панес адказнасьць? Партбонзы? Здаецца, ня чулі мы такога. І не пачуем. Не прынята ў Расеі каяцца. А варта зрабіць гэты дзень – Днём пакаяньня ды, ня ведаю як, а вымольваць даравањне ў афганскага народа.

Я ня маю на мэце прынізіць гераічнасьць, мужнасьць, праявы высакароднасьці канкрэтных савецкіх салдатаў і афіцэраў. Яны лічылі, што выконваюць свой абавязак перад Радзімай па яе абароне. Толькі вось мала хто задумваўся пра тое, што за патрэбу мае Радзіма на чужой зямлі. Тых, хто задумваўся, не слухалі, нават аб'яўлялі ворагамі.

Афганцы-ж баранілі свабоду сваёй Радзімы ад захопнікаў. Менавіта яны ёсьць патрыётамі й за сваю свабоду яны заплацілі свой кошт... Хто адкажа за гэта? Нашыя дзеці ды ўнукі будуць выкупляць віну сваіх бацькоў, як цяпер гэта робіць Нямеччына?!

Няхай не адразу, але праўда прарвалася да нас. І некаторыя пакаяліся за свае, а таксама агульныя, грахі. Ім здавалася, што толькі пасьля гэтага можна крочыць далей: з чыстымі думкамі, з чыстым сэрцам, памятаючы пра мінулае.

Аднак руху наперад не атрымоўваецца: «...цяжар мінулага на нашых нагох, кроў на нашых рукох – гэта засланяе нам зрок...» Нашыя бацькі прызвычаіліся трываць усё, што вытварала камуністычная мафія. Яны заўсёды казалі: «Абы не было вайны» – і трывалі. Больш за паўстагодзьдзя, як вайна скончылася, а мы ўсё азіраемся на яе, нібы стаіць, праклятая, за нашымі дзьвярыма. І ўлада сёньня эксплюатуе страх нашых бацькоў. Рэжым спрабуе аднавіць тыя міты, на якіх стаяла савецкая імпэрыя, вяртаючы даты як сьвятаў. Вось і 23 лютага стаў днём абаронцы Айчыны.

Рэжыму патрэбныя героі, якія б аздобілі крыху – такі непрывабны – твар ягоны. Удзельнікам-жа афганскай вайны патрэбная дапамога: мэдычная й матэрыяльная. Вядома, такога ад нашай дзяржавы чакаць не выпадае. Удзельнікаў вайны ў Афганістане прыраўнялі да вэтэранаў Вялікай Айчыннай. А набор ільготаў, што яны маюць, цягне хіба што на зьдзек.

Усім, хто прайшоў праз тую вайну, патрэбны сапраўдны клопат. Трэба лекаваць іхныя душы. Улада-ж цынічна выкарыстоўвае іх, а яны паміраюць маральна, паміраюць фізічна. За мінулы год на Магілёўшчыне іх памерла яшчэ 11. Для іх вайна – працягваецца. Як і для нас. А каб вярнуцца з вайны, мы мусім скінуць з вачэй заслону. Тую, што не дае ўбачыць праўду. І пакаяцца. Шчыра. За сябе. За бацькоў, за дзядоў. Пакаяньне ня ёсьць праявай слабасьці, наадварот – адметнасьцю чалавека, народа, што выздараўлівае. Мы-ж хворыя на вайну. Мы слабыя.

Мы ўсё яшчэ на вайне...

Валадар ЦУРПАНАЎ

ПА СТАРОНКАХ ПРЭСЫ

Калі вайскоўцы разважаюць на палітычныя тэмы – чакай бяды

Прозьвішча генэрала Ўсхопчыка, што камандуе сёньня 5-м вайсковым корпусам у Бабруйску, прымушае ўздрыгануцца ўсіх, хто больш-менш ведае найноўшую гісторыю.

Генэрал напачатку 90-х гадоў служыў у Вільні начальнікам савецкага вайсковага гарнізона. Якраз у той час, калі Літва разам зь іншымі краінамі Балтыі вырашыла канчаткова здабыць незалежнасьць. Савецкія войскі падчас віленскіх палітычных падзеяў, як вядома, адыгралі ня самую добрую ролю.

Але перамагла Літва. Генэрал апынуўся ў сувэрэннай Беларусі. Тут яму, праверанаму афіцэру савецкай Арміі, даверылі асобны вайсковы корпус. Камандуе, вучыць салдат і афіцэраў, мацуе баявую і палітычную загартоўку падначаленых. Але час ад часу ня можа стрымаць сваіх палітычных меркаваньняў, тым больш, што мясцовыя выданьні ахвотна прадастаўляюць генэралу свае старонкі для развагаў. Апошнія зь іх былі надрукаваныя напярэдадні 23 лютага, савецкага сьвята савецкай-жа арміі. Што-ж хвалюе генэрала, пра што ён напружана думае?.. Вось некалькі шчырых генэральскіх прызнаньняў.

«Мая думка, – зазначае камандзір корпуса, – палягае ў тым, што рана мы пазбавіліся ад ядзерных ракетаў. Чаму адны дзяржавы могуць мець такую зброю, а мы – не?»

«Мне, выхаванаму ў савецкія часы, ніцкавіцка зразумець, чаму амэрыканцы хочуць быць, напрыклад, у Польшчы. Каб дыктаваць сваю волю, навязваць свае ўмовы. Прымаюць такія паводзіны толькі рабы. Таму сядзець і чакаць, што нехта прыйдзе і аб'яднае нас перад пагрозаю NATO, нельга. Паасобку славяне моцнымі быць ня могуць».

«Сьвет нестабільны сёньня. Толькі недалёкі чалавек ня можа не разумець сытуацыі, што складваецца вакол нашай рэспублікі».

...Вайсковае мысьленьне ўвогуле і варожае стаўленьне да ЗША, у прыватнасьці, (як і да ўсіх, «хто ня з намі») выхоўвалася многімі папярэднімі дзесяцігодзьдзямі савецкай улады. Тым больш сярод ваенных. Гэта зразумела. Як зразумела і тое, што сапраўды не заўсёды гэта лёгка, – засвоіць новае разуменьне гісторыі, адмовіцца ад састарэлых ідэалягічных штампаў, пераацаваць «заваёвы» нашай ранейшай агульнай краіны СССР на падставе цяпер даступнай праўды і сумленнага аналізу «перамогаў»...

Не зразумела іншае! На якой падставе генэрал, які працягвае служыць у войску, а гэта значыць – мае ў сваім распараджэньні салдатаў і зброю, дазваляе сабе выказвацца палітычныя меркаваньні, якія супярэчаць абвешчанаму нашай краінай курсу на нэўтралітэт, павагу да суседзяў, прызнаньне за імі права самім вырашаць свае ўнутраныя і вонкавыя праблемы? Не гаворачы аб супярэчлівасьці ягоных выказваньняў таму, што называецца здаровым сэнсам...

Адказ, на жаль, просты як яйка. Гэтаму генэрал не супярэчыць. Бо ведае, лепш за нас з вамі, сапраўдную ваенную дактрыну свайго прэзыдэнта. Ведае меркаваньні й выказваньні свайго вярхоўнага галоўнакамандуючага. Ведае настрой расейскіх мякашовых наконт «славянскага братэрства» і неабходнасьці нібыта абароны гэтага мітычнага братэрства ад розных там... (далей па тэксту мітынговых выступаў камуністычных генэралаў і лідэраў). Такім чынам, няма тут «незразумеласьці». Небясьпека – ёсьць.

Рэдакцыйны АГЛЯДАЛЬНІК друку й пошты

Права гаварыць і права быць пачутым

ТЭМА НУМАРУ

Які год журналісты і сродкі масавай інфармацыі зьяўляюцца ў нашай краіне найбольш прыцягальнымі аб'ектамі жорсткае ўвагі з боку ўладных органаў і структураў. Дзяржаўным выданьням яны, гэтыя органы і структуры, не даюць вольна дыхаць, паколькі пасьляхова пераўтварылі «свае» газэты, тэлебачаньне і радыё ў рупары аднабаковай прапаганды і такой-жа аднабаковай інфармацыі. Незалежныя газэты адчуваюць на сябе штодзённы ўціск, паколькі засталіся ледзь не апошнімі абаронцамі рэшткаў беларускае дэмакратыі.

Незалежныя СМІ ў адзін дзень маглі б быць паніштаныя пад катком дзяржаўнае рэпрэсыўнае машыны. Ня робіцца гэта, відаць, і па той прычыне, што ўсе беларускія грамадзкія арганізацыі і аб'яднаньні – асабліва тыя, якія маюць міжнароднае прызнаньне – пасьлядоўна і пастаянна выступаюць на баку свабоды слова. Беларускі Хельсінскі камітэт, «Вясна-96», «Хартыя-97», Асамблея няўрадавых арганізацый, Беларуская асацыяцыя журналістаў кожным разам, як толькі парушаюцца правы журналістаў і зьяўляюцца перашкоды на шляху ўсталяваньня свабоды слова, рашуча і адкрыта, як гаворыцца, «б'юць ва ўсе калакалы». Іх чуюць – і дома, і ў замежжы. (На жаль, ніяк не праяўляе сябе ў гэтай пачэснай справе Беларускі Саюз журналістаў).

Затое клопат аб свабодзе журналісцкай творчасьці ўсё больш уражліва праяўляе Беларускі ПЭН-цэнтар. Гэтае аддзяленьне аўтарытэтнай і, нават, элітарнай міжнароднай арганізацыі, вядомай як ПЭН-клюб, вядзе руплівую працу па стварэньню маніторынга парушэньняў з боку ўлады ў галіне беларускіх СМІ. Днямі ПЭН-цэнтар склікаў у Менску міжнародны круглы стол для абмеркаваньня насьпеўшае тэмы: «Абарона пісьменьнікаў і журналістаў». З удзелам калегаў зь Літвы, Чэхіі, Латвіі, Польшчы, Украіны беларускія ўдзельнікі канцэптуальнай гаворкі прыйшлі да высновы, што ў нас, пры ўсім шчыраваньні на гэтую тэму, **адсутнічае эфэктыўная мэтодыка пратэсту.** Як зазначыў вядучы круглага стала, віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-цэнтру Карлас Шэрман, заявы і пратэсты маюць сэнс там і тады, дзе й калі ёсьць ня толькі права гаварыць, але – і права быць пачутымі. Маніторынгі, Белыя ці Жоўтыя кнігі, мітынговыя акцыі пратэсту – ўсё гэта важна і патрэбна. Аднак нельга не бачыць, што ў Беларусі тыповая ўсходняя сытуацыя: сабака брэша, а караван ідзе. Што-ж рабіць?

Падалося, што на гэтае пытаньне круглы стол не адказаў. Па меншай меры, не адказаў у поўным аб'ёме. Выступы замежных гасьцей, гаворкі, цікавыя самі па сабе, выглядалі нечым далёкім і недасягальным пакуль для Беларусі. Праблема для ўладаў балтыйскіх краінаў, Чэхіі і Польшчы палягае сёньня ў тым, каб абараніца ад непрыстойных, сапраўды неаб'ектыўных нападак прэсы на дзяржаўных асобаў. Тое, што ніводзін чыноўнік, ніводзін палітык і кроку ня могуць ступіць без журналісцкага прыгляду – гэта проста «агульнае месца» штодзённай практыкі. Ніхто не асьпрэчвае правы СМІ менавіта так і рабіць, калі гаворка йдзе пра палітыку, службовыя дзеяньні й г.д. Грамадзтва так далёка зайшло ў разуменьні свабоды слова, што чыноўнікам, незалежна ад рангу, даставецца ў прэсе за прыватныя ўчынкі, за паводзіны ў асабістым жыцьці... Як гаворыцца, нам бы іх праблемы!

У нас – свае. Другая праблема ў дадатак да той, што пазначаная вышэй, – гэта зачыненасьць беларускай сытуацыі для эўрапейскіх суседзяў. Цяжка сказаць, чым гэта тлумачыцца, паколькі, здаецца, што Захад толькі пра «беларускую занозу» і думае. Але вось факт. Прэзыдэнт БАЖ Жана Літвіна падчас круглага стала паведаміла – ніхто з прысутных не хацеў у гэта паверыць, але-ж гэта так! – што ў першым радку штогадовага Даклада АБСЭ аб сытуацыі ў Беларусі адзначаецца: «права на свабоду слова ў асноўным захоўваецца». Гэтая выснова сталася шокам на фоне нядаўняга чарговага наступу на незалежныя выданьні ў сувязі зь інфармаваньнем імі чытачоў пра аб'яўленыя на травень Вярхоўным Саветам прэзыдэнцкія выбары. Залпавае папярэджаньне 6-ці менскіх выданьняў і шэрагу мясцовых газэтаў, пагадзіцеся, сьведчыць пра што іншае, але ніяк не пра захаваньне свабоды слова. Справа нават ня ў тым толькі, што ўладзе не спадабаецца тэма публікацыяў і яна прымае меры для таго, каб іх не дапусьціць. Справа ў мэтодыцы дасягненьня такога намеру: журналісты й выданьні абвінавачваюцца ні ў чым іншым, як у праваканьні й закліку да... захопу ўлады (?!) Нашыя замежныя калегі, што ўдзельнічалі ў круглым стале, толькі паціскалі плячыма і далікатна ўсьміхаліся. Але нам не да такіх жэстаў. У нас шмат работы на журналісцкім напрамку. Шмат работы таксама ў грамадзтва на полі змаганьня за нацыянальны і палітычны сувэрэнітэт краіны. Рознага кшталту свабодаў, у тым ліку і ў галіне СМІ, нашыя суседзі дасягнулі ў выніку менавіта такой работы. Пакуль нашае грамадзтва не аб'ядналася вакол асноўнае ідэі цывілізаванага існаваньня й разьвіцьця краіны, – ня можа паасобна зацьвердзіцца і перамагчы ніякая свабода. Тым больш – свабода слова. Але і пасыўна чакаць народнага прасьвятленьня нельга. Пры ўсіх цяжкасьцях сытуацыі, пакуль сапраўды ёсьць магчымасьць ГАВАРЫЦЬ, недапушчальна маўчаць. Толькі так і можна быць ПАЧУТЫМ.

Сяргей ШЫШКІН,
старшыня Магілёўскай гарадзкой філіі БАЖ

Праграма тэлебачаньня з 1 сакавіка па 7 сакавіка

•• Понедельник, 1 марта ••

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізічна (па часе) не паспявае яе перакласці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ
6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.55 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 Телебарометр.
9.40 "Сегодня с вами..." Народный артист Беларуси Борис Луценко.
10.05 Здоровье.
10.30 Усадьба.
11.15 Б.Фоссе в телесериале "Замок Олив" (Франция). 1-я серия.
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.15 М.Манойлович в худ.фильме "Другая Америка" (Франция — Англия — Германия).
14.45 Мультфильм.
15.15 Сериал для детей. "Чародей" (Австралия — Польша). 1-я серия.
15.40 Видеокурс французского языка.
16.05 ТВ — школе. 3-й класс. Эдди Огнецвет.
16.25 Мультфильм.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..." Концерт группы "Рублевая зона".
17.40 "Под знаком любви". Док. фильм.
18.05 Б.Фоссе в телесериале "Замок Олив" (Франция). 1-я серия.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Л.Касаткина в фильме "Душечка".
23.15 Криминальная хроника.
23.20 Белорусский хит-парад.
23.25 Третий тайм.

ОРТ
8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.10 Здоровье.
9.40 Мультфильм.
10.00 Поле чудес.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Новые приключения Синдбада".
14.40 "Синеглазка". Мультфильм.
14.55 Звездный час.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Эти забавные животные.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Программа "Мы".
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 "Горец-IV".
21.45 Взгляд.
22.30 Новость дня.
22.50 "Лестница в небо". Худ. фильм.

"РОССИЯ"
6.00, 6.25, 7.00, 8.30 Доброе утро, Россия.
6.20 "У всех на устах".
6.45 "Программа передач".
8.15 Дежурная часть.
8.35 TV-club.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.40 Вести.
15.10 Мультфильм.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Мультфильмы.
17.30 Д. Коллинз и Т. Далтон в телесериале "Грехи" (США).
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 Любовь с первого взгляда.
20.30 Б. Щербаков и Н. Белохвостикова в драме "Десять лет без права переписки".
22.20 Акуна матата.
23.25 Дежурная часть.
0.15 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"
7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.05 Новости культуры.
7.25 "Белый Клык". Худ. фильм.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 Сборник короткометражных фильмов Д.-У.Гриффита.
10.05 Пролетая над гнездом Синей птицы.
10.50 Музыка из Петербурга.
11.40 После новостей...
12.00, 12.45 "Жизнь и необычные приключения мастера Михаила Афанасьевича и его Маргариты — Елены Сергеевны". Спектакль.
12.40 Анатолий Гальб.
13.29 Азбука.
13.45 За околицей.
14.00 Академия спорта.
14.20 "15-й подъезд".
14.45 "Без визы". Пассау.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
16.00 Кумиры.
17.05 Боярский двор.
17.35 Поет О.Погудин.
17.45 Мир авиации.
18.10 "Его любили все". Вечер памяти Евгения Евстигнеева.
19.05 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 "Прогулки с Мартином Скорсезе". Док. фильм (США).
21.05 После новостей...
21.25 "Судьба семьи Цветаевых".
22.05 Сборник короткометражных фильмов Д.-У.Гриффита.

НТВ
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Ее звали Никита".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Вчера в "Итогах".
10.15 Куклы.
10.30 Итоги. Ночной разговор.
11.30 "Колье Шарлотты". Худ. фильм.
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Конан" (США).
16.20 Мультсериал "Ну, погоди!"
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ
12.25 Пунктир.

"МОГИЛЕВ-1"
17.30 "Блистательные Азераки".
18.30 "Глаша и Кикимора". Мультфильм.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Служили два товарища". Худ. фильм.
23.10 День области.
23.20 "С меня хватит".Крим. драма.

2 КАНАЛ
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Акапулько".
21.40 "Слепой свидетель". Худ. фильм.
23.10 "Клуб "Белый попугай".
23.35 Спортивная программа.

•• Вторник, 2 марта ••

БТ
6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.55 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 ТВ — школе.
9.30 "На волне взаимопонимания".
10.10 Станция "Академия наук".
10.30 "Сегодня с вами..." Главный редактор газеты "Культура" Людмила Крушинская.
11.10 "Замок Олив". 2-я серия.
12.05 Третий тайм.
12.35 "А музыка звучит..." Поет Валерий Леонтьев.
13.15 Поэт Анатолий Греченников.
14.00 [illegible]
14.25 Бездельник.
15.15 "Чародей". 2-я серия.
15.45 Видеокурс английского языка.
16.10 ТВ — школе. 9-й класс. Творчество Максима Танка.
16.40 "Отражение". Док.фильм.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
17.35 Гости в дом.
18.00 "Замок Олив". 2-я серия.
19.15 "Алло, "Событие".
19.55 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Голубой карбункул". Худ.фильм.
23.15 Криминальная хроника.
23.20 Белорусский хит-парад.
23.25 Музыкальный салон. Гости программы — Мария Пахоменко и Александр Колкер.

ОРТ
8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Взгляд.
10.00 Мультфильм.
10.20 Смехопанорама.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Новые приключения Синдбада" (Заключительная серия).
14.40 "Шарик-фонарик". Мультфильм.
14.50 Счастливый случай.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Тема.
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 И.Макарова и Н.Рыбников в кинокартине "Высота".
22.30 Л. Гузеева в программе "Женские истории".
23.00 Новость дня.

"РОССИЯ"
6.00, 6.25, 7.00, 8.30 Доброе утро, Россия.
6.20 "У всех на устах".
6.45 "Программа передач".
8.15 Дежурная часть.
8.35 TV-club.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.05 Мультфильмы.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Мультфильмы.
17.30 Телесериал "Грехи" (США).
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 "Аншлаг" представляет.
20.30 Мелодрама "Сделка" (США).
22.20 "Пси фактор".
23.20 Дежурная часть.
0.10 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"
7.05, 11.30, 13.30, 17.40, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Прогулки с Мартином Скорсезе". Док. фильм.
8.40 Академия спорта.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Последняя ночь". Худ. фильм.
10.35 Художница Е.Кочетенкова.
11.00 Мир авиации.
11.40 После новостей...
12.00 "Без визы".
12.10 Бриллианты мирового балета.
13.00 "Спортивные встречи".
13.29 Азбука.
13.45 "Российский курьер".
14.25 "Рассказы старого сплетника".
14.50 Живое дерево ремесел.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 Мультфильм.
16.15 "Пушкин и судьбы русской культуры".
17.05 Ортодокс.
17.25 Ноу-хау.
17.55, 19.50 С.Слонимский. Опера "Видение Иоанна Грозного".
19.35 Чудо-сказка.
21.05 После новостей...
21.25 "Последняя ночь". Худ. фильм.

НТВ
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Герой дня без галстука.
9.40 Криминал.
10.05 Своя игра.
10.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.30 "Колье Шарлотты". Худ. фильм.
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Конан" (США).
16.20 Мультсериал "Ну, погоди!"
16.30 Впрок.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ
12.05 Тяжелый день.
12.30 Бобруйский вариант.
12.50 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"
17.30 "Блистательные Азераки".
18.20 Катастрофы и войны недели.
18.45 "Колобок".Мультфильм.
19.00 Служба ваших забот.В студии первый заместитель начальника УВД Могилевского облисполкома И.Ермолович.
19.40, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Мастера угроз".Комедия.
23.10 День области.
23.20 "Сумерки".Триллер.

2 КАНАЛ
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Акапулько".
21.30 Высокая мода.
21.40 Ф.Неро в драме "Легенда о Валентино".
23.10 "Удивительные истории".
23.35 Спортивная программа.

•• Среда, 3 марта ••

БТ
6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.40 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс английского языка.
10.05 "Навстречу".
10.20 Видимо-невидимо.
11.10 "Замок Олив". 3-я серия.
12.05 Компьютерный полигон.
12.25 Зорная ростань.
13.00 Новости.
13.10 М.Терехова и Ю.Назаров в фильме "Давай поженимся".
14.35 Четвертое измерение.
15.15 "Чародей". 3-я серия.
15.40 Видеокурс французского языка.
16.05 "5 х 5".
16.35 "Куда пойти учиться?"
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 "Судьба моя и надежда".
18.05 "Замок Олив". 3-я серия.
19.15 "Сегодня с вами..." Министр внутренних дел Республики Беларусь Юрий Сиваков.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Бег от смерти". Худ.фильм.
23.30 Криминальная хроника.
23.35 Белорусский хит-парад.
23.50 Королевская охота.
0.20 Настольный теннис. Евролига. Мужчины. Беларусь — Испания.
0.55 Темная комната.

ОРТ
8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Тема.
9.55 "Добрыня Никитич". Мультфильм.
10.15 В мире животных.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Принцесса подводного царства". Мультфильм. Часть 1-я.
14.45 Зов джунглей.
15.10 Детские анекдоты.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Человек и закон.
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 "Любимая женщина механика Гаврилова". Худ. фильм.
22.20 Иосиф Сталин и Надежда Аллилуева: жестокий роман.
23.00 Новость дня.

"РОССИЯ"
6.00, 6.25, 7.00, 8.30 Доброе утро, Россия.
6.20 "У всех на устах".
6.45 "Программа передач".
8.15 Дежурная часть.
8.35 TV-club.
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.30 Вести.
15.10 Мультфильмы.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Мультфильмы.
17.30 Телесериал "Грехи" (США).
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 Сам себе режиссер.
20.25 К. Тарантино в криминальной драме "Дестини включает радио".
22.15 "Притворщик".
23.15 Дежурная часть.
0.00 Автошоу.
0.35 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.15 П.И.Чайковский. "Франческа да Римини". Исполняет ГАСО.
9.40 Художник В.Конопкин.
9.55 "Парадоксы истории".
10.25 О пользе традиций, или Русские в Англии.
11.30, 13.30, 20.20, 23.05 Новости культуры.
11.40 После новостей...
12.00 Никита Подгорный.
13.00 Поет Н.Брегвадзе.
13.10 К 100-летию Ю.Олеши "...Не то веселый Дант, не то суровый Чаплин".
13.29 Азбука.
13.45 А.С.Пушкин. "Скупой рыцарь".
14.10 А.Вивальди. "Времена года".
14.50 Живое дерево ремесел.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.30 "Лукоморье".
15.50 "Зимние грезы". Королевский балет Великобритании.
17.05 Ваше сословие.
17.30 Т.Окуневская.
17.55 "Кто мы?"
18.20 Чудо-сказка.
18.45,21.00 Г.Горин. "Поминальная молитва". Спектакль "Ленкома".
20.19 Азбука.
20.40 После новостей...
22.25 А.Дворжак. Симфония "Из Нового Света". Исполняет ГАСО.

НТВ
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 Худ. фильм "Пышка".
10.40 "Среда".
11.30 "Колье Шарлотты". Худ. фильм.
13.35 "Телеспецназ". "Подземная лодка".
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Конан" (США).
16.20 Мультсериал "Ну, погоди!"
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ
12.05 Служба ваших забот. В студии первый заместитель начальника УВД Могилевского облисполкома И.Ермолович.
12.40 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"
17.30 Мужской клуб."Народ против порнографии?".
18.20 ДАО.
18.45 Ток-шоу "Лестница".
19.20, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
21.50 Астро-дайджест.
21.35 "Сумеречная зона".Фантастика.
23.15 День области.
23.25 "Черная стрела".Худ.фильм.

2 КАНАЛ
18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Акапулько".
21.40 Мелодрама "Неудобная женщина". 1 ч.
23.10 "Случайный свидетель".
23.35 Спортивная программа.

•• Четверг, 4 марта ••

БТ
6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.40 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.10 Королевская охота.
9.40 Настольный теннис. Евролига. Мужчины. Беларусь — Испания.
10.15 Телебом.
11.15 "Замок Олив". 4-я серия.
12.05 Наш край.
12.25 "А музыка звучит..."
13.15 "Задача с тремя неизвестными". Худ.фильм. 1-я серия.
14.20 "Парсифаль, или Праздник осенней луны". Док.фильм.
14.30 Столица.
15.10 "Чародей". 4-я серия.
15.35 Видеокурс английского языка.
16.00 ТВ — школе. Музыка. 5-й класс.
16.30 Гости в дом.
17.10 Ток-шоу "Карамболь" с участием Гарика Сукачева.
17.40 "Чтоб снова жизнь начать". Телеочерк.
18.05 "Замок Олив". 4-я серия.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Концерт, посвященный Дню белорусской милиции.
23.50 Криминальная хроника.
23.55 Белорусский хит-парад.
0.00 Крок.
0.30 Акколада.

ОРТ
8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Человек и закон.
9.55 Мультфильм.
10.05 Клуб путешественников.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Принцесса подводного царства". Мультфильм. Часть 2-я.
14.45 Классная компания.
15.05 "Улица Сезам".
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 "В поисках утраченного". Татьяна Окуневская.
18.50 Телесериал "Вечный зов".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 Футбол. Кубок кубков. 1/4 фина-

ла. "Локомотив" — "Маккаби" (Израиль).
22.50 Новость дня.
23.05 "Тихий дом" в Берлине.

"РОССИЯ"

6.00, 6.25, 7.00, 7.30, 8.30 Доброе утро, Россия.
6.20 "У всех на устах".
6.45 "Программа передач".
7.20 Торговый дом "Ле Монти".
8.15 Дежурная часть.
8.35 TV-club.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.20 Вести.
15.10 Мультфильмы.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Мультфильмы.
17.35 Телесериал "Грехи" (США).
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 "Два рояля".
20.45 А. Кузнецов, В. Талызина, Л. Зайцева и И. Розанова в сатирической комедии "Летучий голландец".
22.20 "Слушается дело".
23.05 Дежурная часть.
23.50 Горячая десятка.
0.50 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 А.Вивальди. "Времена года".
8.00 Вечер памяти Е. Евстигнеева.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Волга-Волга". Худ. фильм.
10.55 Пушкин женится.
11.40 После новостей...
12.00 "Без визы".
12.10, 13.45 Н.В.Гоголь. "Мертвые души". Спектакль.
13.29 Азбука.
14.30 Художник Р.Семашкевич.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
16.00 Диалог после паузы.
16.30 "Ключи серебряные". Премьера.
17.05 "Российский курьер".
17.45 Новое кино.
18.10 Музыка И.Брамса и Ф.Шопена.
18.20 "Поэтический театр Михаила Козакова". А.Ахматова. "Реквием".
18.45 "Повержен будет Вавилон". Фильм 1-й.
19.10 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 В гостях у Елены Языковой.
20.00 "Время музыки".
20.30 После новостей...
20.50 "Волга-Волга". Худ. фильм.
22.40 Джазофрения.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Худ. фильм "На семи ветрах".
11.30 "Колье Шарлотты". Худ. фильм.
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняачко". Красная стрела.
15.30 "Конан" (США).
16.20 Мультсериал "Ну, погоди!"
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.10 "Песняры" в Могилеве.1-е отд. концерта.
14.10 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Ток-шоу "Я сама".
18.25 "С праздником весны!".ОАО"Бобруйский кожевенный комбинат".
18.50 Мультфильм.
19.00 Родительский час."Интересы ваших детей".
19.45, 21.00. Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Иван Бровкин на целине".Комедия.
23.10 День области.
23.20 Детектив.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Киноконцерт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Пляж".
21.30 Высокая мода.
21.40 Мелодрама "Неудобная женщина". 2 ч.
23.10 "Помню... Люблю...".
23.35 Спортивная программа.

•• Пятница, 5 марта ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.55 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс английского языка.
10.05 Уроки Н.Новожиловой.
10.30 "Все дело в шляпе".
11.15 "Замок Олив".
12.15 Сделано в Беларуси.
12.30 Бон тон.
13.10 "Задача с тремя неизвестными". Худ.фильм. 2-я серия.
14.15 "Антология белорусской поэзии".
14.30 "По заповедным местам Беларуси".
15.15 "Чародей". 5-я серия.
15.40 Судьба моя и надежда.
16.05 Регион.
16.30 "Риск-версия".
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 Наш край". Альбом путешествий".
18.00 "Замок Олив". 5-я серия.
19.15 "Сегодня с вами..." Следователь по особо важным делам Полоцкого РОВД подполковник милиции Тамара Гайфулина.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Аль Пачино в фильме "Автора! Автора!"(США).
23.45 Криминальная хроника.
23.50 Белорусский хит-парад.
0.05 Хоккей. Чемпионат ВЕХЛ. "Тивали"(Минск) — "Полимир"(Новополоцк). 3-й период.
0.45 С.Сандрелли в худ. фильме "Дезидерия и внутренняя жизнь"(Италия).

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Программа "Мы".
10.00 "В поисках утраченного".
10.40 Смак.
11.15 Программа "Вместе".
12.00 X фестиваль "КИВИН" в Сочи.
14.15 Фильм С. Спилберга "Земля до начала времен".
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Джентльмен-шоу.
17.45 Играй, гармонь любимая!
18.15 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 Четвертое дело Коломбо. "Развод по-американски".
22.35 Н. Королева в фильме "Документальная сказка о любви".
23.30 Новость дня.
23.45 Е. Яковлева в боевике "Шальная баба".

"РОССИЯ"

6.00, 6.25, 7.00, 7.30, 8.30 Доброе утро, Россия.
6.20 "У всех на устах".
6.45 "Программа передач".
7.15 Тысяча и один день.
8.15 Дежурная часть.
8.35 TV-club.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.30 Вести.
15.10 "Тараканище". Мультфильм.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Мультфильмы.
17.45 Телесериал "Грехи" (США).
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.55 "Городок".
20.30 Комедия "Ищите женщину".
23.15 Дежурная часть.
0.00 Л. Полищук, Е. Кондулайнен и К. Козаков в эротической мелодраме "Дафнис и Хлоя".
1.50 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.05 Новости культуры.
7.25 Ноу-хау.
7.40 "Документ-панорама".
8.30 Консилиум.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Цирк". Худ. фильм.
10.35 Поклонникам Терпсихоры.
10.50 "Российский курьер".
11.40 После новостей.
12.00 Анна Ахматова.
13.05 Художник В.Зелинский.
13.29 Азбука.
13.45 "Время музыки".
14.15 Сокровища Петербурга.
14.30 Фазиль Искандер.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 Чемпионат мира по легкой атлетике в закрытых помещениях.
17.05 Концерт оркестра "Филармония наций". Дирижер Ю.Франтц.
17.25 "Документ-панорама".
18.15 "Наобум". И. Понаровская.
18.45 "Повержен будет Вавилон". Фильм 2-й.
19.10 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 Николай Гумилев.
20.00 "Царская ложа". И.Мусин.
20.40 После новостей...
21.00 Фильм З.Рыбчински. "Вашингтон".
21.35 "Цирк". Худ. фильм.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Худ. фильм "Завещание Сталина".
10.40 Профессия — репортер. "Быт женщину".
11.30 "Колье Шарлотты". Худ. фильм.
13.30 "Арина".
14.20 "Сегодняачко". Красная стрела.
15.30 "Конан" (США).
16.20 Мультсериал "Ну, погоди!"
16.30 Впрок.
16.55 Футбольный клуб.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.10 Родительский час."Интересы ваших детей".
13.50 "Песняры" в Могилеве.2-е отд. концерта.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Рассказы о животных".
18.00 "Закон Берка".Телесериал.
18.45 "С праздником весны!". ООО "Спецкомплект - М".
19.00 В мире эллипсов.
19.35, 21.10 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 Пунктир.
21.00 Астро-дайджест.
21.45 "Палметто".Триллер.
23.40 День области.
23.50 Спорт планеты.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Альфред Хичкок представляет".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Иллюзия убийства".
21.40 Боевик "Большое дело".
23.20 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 6 марта ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Континент.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00,15.00 Новости.
9.10 В.Глаголева и Р.Нахапетов в худ.фильме "Прости нас, первая любовь".
10.15 "Сегодня с вами..." Актер театра "Христофор" Анатолий Длусский.
10.40 Здоровье.
11.05 Вершина мира.
11.30 "Око".
11.55 "Все нормально, мама!"
12.30 Сущность.
13.00 "Легенды о Вильгельме Телле". Заключ. серия.
13.55 Родовод.
14.25 Олимп.
15.10 Уроки Н.Новожиловой.
15.35 Познай себя.
16.00 "Телебом".
16.20 Бон тон.
16.50 Ток-шоу "Это моя работа".
17.25 "Про налоги и не только".
17.55 И.Купченко в худ.фильме "Странная женщина". 1-я серия.
19.10 Приглашение.
19.40 Из достоверных источников.
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Спортлото.
21.50 К.Костнер и Р.Руссо в романтической комедии "Жестяной Кубок".
24.00 Белорусский хит-парад.
0.15 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00 "И еще одна ночь Шахерезады". Худ. фильм.
8.15 Мультфильм "Дарю тебе звезду".
8.30 Слово пастыря.
8.45 Домашняя библиотека.
9.00, 14.00, 17.10, 22.30 Новости.
.15 Программа "100%".
9.45 "Утренняя почта".
10.20 Смак.
10.40 Возвращение Третьяковки.
11.05 "Нелегальный визит в Россию".
11.35 Мультфильм.
12.00 С.Никоненко, Л.Полищук в фильме "Если можешь, прости...".
13.20 В мире животных.
14.15 Концерт "Песни Игоря Крутого". Часть 1-я.
16.00 Умники и умницы.
16.25 Как это было. "Взлет и гибель советского Голливуда". 1936 год.
17.30 "Ромео и Джульетта." Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
20.00 Время.
20.50 "Секретные материалы".
22.50 Вупи Голдберг в детективной комедии "Действуй, сестра!"

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильмы.
7.25 Фильм для детей "Сто радостей, или Книга великих открытий".
8.35 Мультфильм.
9.00 Доброе утро, страна.
9.35 "Сто к одному". Телеигра.
10.20 Любовь с первого взгляда.
10.45 Подиум д'арт.
11.15 Золотой ключ.
11.30 Домашние хлопоты.
12.00 "Неделя в Санта-Барбаре".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Неделя власти.
13.55 Мультфильм.
14.05 Н. Кински, П. О'Тул в фильме "В лунную ночь".
16.00 Юбилей Татьяны Шмыги.
17.00 Моя семья.
18.00 Сиреневый туман.
19.30 Мелодрама "Эмма".
21.35 "Поет Юлиан".
23.15 "Смерть и дева". Худ. фильм.

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Книжный кладезь.
9.30 "Поезд идет на восток". Худ. фильм.
11.00 Чемпионат мира по легкой атлетике в закрытых помещениях.
12.00 Дворец дожей (Италия).
12.25 М.Жванецкий. "Одесса. Это не юмор. Это стечение обстоятельств!"
13.29 Азбука.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45,15.35 Ф.Достоевский. "Фома Опискин". Спектакль Московского академического театра им. Моссовета.
15.10 "Очевидное - невероятное".
17.00 Новости.
17.05 "Рассказы старого сплетника".
17.30 Международное обозрение.
18.10 "Судьба, судьбою, о судьбе".
19.25 Чудо-сказка.
19.40 Концерт оркестра русских народных инструментов.
20.25 "Кто там..."
20.59 Азбука.
21.20 "Женщина и четверо ее мужчин". Худ. фильм.
22.50 Блеф-клуб.

НТВ

7.00 Мультсериал "Битлджус" (США).
7.30 Детектив "Наградить (посмертно)".
9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Криминал.
9.40 Впрок.
9.55 Телеигра "Пойми меня".
10.25 "Фитиль".
11.15 Профессия — репортер.
11.30 Своя игра.
12.00 Хоккей на НТВ. "Металлург" (Магнитогорск) — "Динамо" (Москва).
14.30 "Русский век". Олег Романцев.
15.15 "Она написала убийство" (США).
16.10 Суд идет. "Дело о квартирных махинациях".
17.00 Дог-шоу "Я и моя собака".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Удивительные игры народов мира".Индонезия.
18.20 С любовью.
19.30 "Исполнение желаний". Мультфильм.
20.00 С любовью.
21.00 "К-2".Приключения.
22.55 Астро-дайджест.
23.05 Диск-канал.
23.35 "Пляжная академия".Эротическая комедия.

2 КАНАЛ

15.00 "Смеха ради". Худ. фильм.
16.40 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Индийское кино. "Муж поневоле".
21.50 Высокая мода.
21.55 Фильм-катастрофа "Столкновение с бездной".
23.55 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 7 марта ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Док. сериал "Города мира".
8.30 Мультфильм.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.15 "Я рисую".
9.30 Мультфильмы.
10.05 Туробъектив.
10.30 "Все нормально, мама!"
11.05 Международные спортивные новости.
11.30 Арсенал.
11.55 Телевизионный Дом кино.
12.20 Сделано в Беларуси.
12.35 Белорусский дом.
13.05 "Династия-2. Семья Колби"(США). 1-я серия.
14.00 Сельчане.
14.25 Золотые ключи.
15.10 "На волне взаимопонимания".
16.00 Мультфильм.
16.30 Зорная ростань.
17.00 Телебарометр.
17.20 "Странная женщина". Худ. фильм. 2-я серия.
18.25 Фильм-концерт"Минулых дней очарованье".
18.55 Теленавигатор.
19.15 Стадион.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Ток-шоу "Карамболь".
21.25 Фильм Р.Олтмена "Высокая мода"(США).
23.40 Премьера песни.
23.50 Авто-парк.
0.00 Баскетбол. Чемпионат Беларуси. "Гомельские рыси" — "Локомотив" (Витебск). 2-й тайм.
0.40 Бархатный сезон.

ОРТ

6.45 "Новые сказки Шахерезады". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
9.00, 14.00 Новости.
9.15 "Непутевые заметки".
9.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
10.55 Крестьянские ведомости.
11.25 Играй, гармонь любимая!
11.55 Худ. фильм "Молодые".
13.25 "Каламбур".
14.15 "Песни Игоря Крутого". Концерт. Часть 2-я.
16.00 "Колесо истории".
16.50 "Ералаш".
17.20 Э. Пьеха в программе "Женские истории".
17.55 Е.Сафонова и С.Жигунов в фильме "Принцесса на бобах".
20.00 Время.
20.35 Праздничный концерт, посвященный Международному женскому дню.
23.30 Новости спорта.
23.45 Вупи Голдберг в детективной комедии "Действуй, сестра! - 2".

"РОССИЯ"

7.00 Док. фильм "Дом на обочине".
7.30 Служу Отечеству.
8.00 Мультфильмы.
8.30 Почта РТР.
9.00 Доброе утро, страна!
9.30 Сам себе режиссер.
10.00 "Аншлаг" представляет.
10.30 "Городок".
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг.
12.00 "Неделя в Санта-Барбаре".
13.00 Вести.
13.30 Федерация.
14.10 Парламентский час.
15.10 "Закон и порядок".
16.00 Диалоги о животных.
17.00 Старая квартира. Год 1980-й. Часть 2-я.
18.00 Совершенно секретно.
19.00 Зеркало.
20.00 Комедия "Осторожно, двери закрываются" (Великобритания).
21.50 "Уловка-22".
22.45 Дежурная часть.
23.10 Психологическая драма "Принц Гомбургский" (Италия).

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Консилиум.
9.45 "Василиса Прекрасная". Худ. фильм.
11.00 В тридевятом царстве.
11.25 "Экспедиция "Чиж".
11.50 Поклонникам Терпсихоры.
12.00 "Великие дворцы мира".
12.25 М.Жванецкий. "Ленинград. Прекратите хохотать: вы мне мешаете говорить!" 2-я серия.
13.29 Азбука.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 Про фото.
14.10 Мультфильм.
14.20 Чемпионат мира по легкой атлетике в закрытых помещениях.
15.50 "Судьба, судьбою, о судьбе".
17.00 Новости.
17.05 Телесуфлер.
17.20 "С потолка".
17.45,19.45 Ж.Оффенбах. "Сказки Гофмана". Романтическая опера.
19.00 Чудо-сказка.
20.59 Азбука.
21.20 Бенефис М.Глузского.
22.15 "Чудак". Худ. фильм (США).

НТВ

7.00 Комедия "Богатая невеста".
8.30 "Фитиль".
9.00, 11.00 Сегодня.
9.15 З. Цибульский в остросюжетном фильме "Пепел и алмаз" (Польша).
11.20 Большие деньги.
11.45 "Русский век". Ирина Бугримова.
12.20 Н. Линичук и Г. Карпоносов в фильме "Ледовая легенда".
12.55 Фигурное катание. Финал чемпионской серии. Показательные выступления.
15.30 М. Кокшенов, Б. Щербаков и Л. Полищук в комедии "Третий не лишний".
16.45 "Арина".

2 КАНАЛ

15.00 "Черные кошки в бамбуковых зарослях". Худ. фильм.
16.35 "Шестнадцатилетние".
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 "Двенадцать месяцев". Сказка.
19.20 Муз. антракт.
19.35 "1/52". Спортивное обозрение.
19.50 "Секретные материалы".
20.35 Мультфильм.
20.40 "Пляж".
21.25 Высокая мода.
21.30 Приключенческий боевик "Двойной взрыв".
23.50 Спортивная программа.

ВАНДРОЎКА ЗА КРАТЫ

СУЧАСНЫ ЛЕТАПІС

Андрэй МЕЛЬНІКАЎ

Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.

Адылі мяне перакідаюць у камэру №4.

Адзінота. Засьцілаю тапчан, разьвешваю на ўсім магчымым штармоўку, майку, джынсы, шкарпэткі, з задавальненьнем расьцягваюся.

Нядоўгі той спакой. Выдзёргваюць у санчастку. І мяне і Алега. Ветлівы абыякавы доктар заводзіць на нас мэдкарткі, пытае пра самаадчуваньне, скаргі, былыя хваробы, быццам бы запісвае, дазваляе паліць вады з пад крана і памыць там-жа рукі.

Паміж санчасткай і ИВСам – яблыні. Алег зрывае некалькі яблыкаў. Гэта апошні прыём ежы перад галадоўкай.

Ежу вартавыя атрымліваюць у адны рандэлкі – і для сябе і для затрыманых. Так што галадоўшчыкі – на карысьць астатнім, асаблівa, калі ежы мала і яна смачная (а тое ўзаемазьвязана). Не каштую пагранцоўскую ежу, але выглядае яна прыстойна. І малочны суп прапаноўваюць. Ну ды добрая кухня для малых калектываў – ня дзіва.

Стасункі з ахоўнікамі складваюцца няблага. Сярод іх – шмат аршанцаў і магілёўцаў. Першыя сымпатызуюць мне, як земляку (больш працяглыя гулкі, аднойчы – патройная доза гарбаты), другія – проста «блатуюць» (усе маюць клікухі-«паганяла», а затрыманым робяць усемагчымыя паслабленьні, апрача ежы), праўда – ня ўсе. Некалькі магілёўскіх вызначаюцца прэзыдэнцкім патрыятызмам ды эканамічным мысленьнем: яны пакупаюцца за цыгарэты і прадукты з дачак (датковыя гулкі за кошт іншых). У мяне няма ні цыгарэт, ні прадуктаў, таму ў адну з магілёўскіх зьмен безвылазна сяджу ў камэры шаснаццаць гадзін (з васьмі вечара да полудня), што без парашы некалькі цяжкавата.

На новым месцы добра спаць і жамяра не данімае. Ранкам, калі выпускаюць да санвузла, раблю невялічкую пасьцірушку і абдаюся да пояса вадой з-пад крана. Жыцьцё файна!

Позна ўвечары гаўптвахтчыкаў хуценька пераганяюць на гаўптвахту (некуды на тэрыторыю часткі), а на ИВС селяць ажно шасьцёх затрыманых. Адзін зь іх трапляе ў мой нумар. Высокі, худы, трохі маладзейшы за мяне. Адразу прыносіць пэўную нязручнасьць, бо паліць – псуе паветра. А пакой вэнтылюецца толькі калі ненадоўга адчыняюць «кармушкі» (што бывае рэдка) ці пад час гулкі. Знаёмімся. І. – з гаварлівых.

Усіх шасьцёх затрымалі ў Каменным Логу (знакамітым пасьля гістарычных здымкаў Шарамета памежным населеным пункце) пры ўдзеле спэцбрыгады зь Менску. Спэцназаўцы былі ў масках, дзейнічалі жорстка і здымалі ўсё на відза. І. выклікала на двор маці – там яго і павязалі. Такім-жа чынам узялі яго брата, суседа, госьця зь Летувы і двух гасьцей з Ніжняга Ноўгарада. Расейцы везьлі ў Летуву на продаж гаечныя ключы, якія іх прадпрыемства выдала ў якасьці заробку. Адзін зь іх паспрабаваў супраціўляцца і яго капітальна зьбілі. І. праседзеў усю ноч у аўтамабілі, прышпілены да руля «брасьлетамі», падобна, як і астатнія затрыманыя, пакуль «спэцы» спрабавалі адшукаць ящчэ й суседава брата. А той

прадбачліва рвануў празь мяжу на трактары лясной дарогай.

Новы знаёмца ня так даўно сам быў прапарам у гэтым пагранатрадзе. Звольніўся, па яго словах, з-за канфлікту з Аляксандрам Пятровічам Лапо. Таму не спадабалася, што ягоны малады падначалены прыехаў на суботнік на ўласнай «иномарке», ці не такой-жа, як і ў яго. Цяпер, перагаварыўшы з былымі калегамі, І. мяркуе, што пасьля Шараметаўскай «вылазкі» Менску трэба тэрмінова паказаць пасьпяховую працу беларускіх пагранцоў на гэтым участку мяжы. Таму і прыехаў спэцатрад з цэнтра з відзатэхнікай і папацаваў «на карцінку», выкарыстаўшы зручную для гэтага сытуацыю з гасьцямі ў двух жыхароў Лога. Зараз, па-мінімуму, «карцінкай» усё і скончыцца. А па-максымуму, пры зручных паказаньнях затрыманых і іх падатлівасьці, можна будзе з усёй шасьцёркі стварыць «міжнародную злачынную групу».

Пазьней у Гарадзенскай турме давялося пасядзець разам з крэўнікам падробнай, ужо «раскручанай», «міжнароднай злачыннай групы». «Вялікі Мафіёзі» таксама быў былым пагранцовым прапарам і, на яго няшчасьце, меў шматнацыянальнае кола знаёмых, якія дапамагалі спачатку ў справах, а пасьля – сесьці. Суд над гэтымі «злачынцамі» беларускімі газэтамі, радыё й тэлебачаньнем шырока асьвятляўся і ўзгадваўся пасьля ящчэ на працягу некалькіх тыдняў. Хаця самое злачынства, з практыкі жыхароў памежжа, было банальным – перапраўлялі мігрантаў у абыход КПП. Ды прапарам, як высьветлілася, у вадрозненьне ад падпалкоўнікаў, не шанцуе.

Навідавоку: «міжнародная група» – вельмі смачны кавалак для карных органаў. Тут і справаздачу па службовай дзейнасьці можна файную «збацаць» і самарэкляму для грамадзкасьці. А там і нейкія мэдальчыкі, а тое й ордэнчыкі на грудзях, зорачкі на пагонах, прэміі ў кішэнях... Грэх не работаць з такім «матэрыялам»!

Грамадзяніна Летувы, затрыманага ў Логу, адпускаюць на працягу сутак. Астатнюю пяцёрку актыўна цягаюць да дазнавацеляў (апроч Шумейкі, гэта бялявы прапар С.). Хлопцы робяцца нашымі сталымі знаёмцамі. Ад вартавых у камэры трапляе некалькі старых кавалкаў газэт. За адсутнасьцю іншага «чытва» падрабязна чытаю гэта.

На гулках бегаю, трохі займаюся фізкультурай, загараю. Абліваюся вадой з-пад крана. Пакуль «чайная галадоўка» абсалютна не замінае. У камэры, калі сусед ня паліць, займаюся практыкаваньнямі з элемэнтамі ёгі. На волі – часу не хапала.

Ходка да дазнавацеляў – таксама неблагі шпацыр. Сонца, сосны... Вяртаючыся, бачу пабітага ў Логу расейца. Невысокі, каржакаваты, коратка стрыжаны.

І суседзі па ИВСу й ахоўнікі прадказваюць хуткае наша з Алегам вызваленьне. На сумесных гулках абмяркоўваем далейшыя дзеяньні. Як аўтастопам ці нават пешшу дабярэмся да яго Жодзішак, як абавязкова скупнемся ў Вяльлі і ў стаўку за Алегавай хатай, як паедзем на «Бардаўскую восень»...

Увечары, калі ўжо пачынае цямнець, і да сканчэньня трохсутачнага законнага тэрміну затрыманьня застаюцца лічаныя гадзіны, канвой зноў вядзе мяне на знаёмы трэці паверх. Сэрца радасна калоціцца: зараз аддадуць пашпарт, вынесуць якое папярэджаньне, і – будзь вольным!

Шумейка прымае мяне ў іншым, больш салідным кабінэце, дзе досыць чыста і тэлефон на стале. Навіна, па яго словах, «не совсем приятная»: рашэньнем в.а. пракурора Смаргонскага раёну Алы Кіндры супраць мяне заведзеная крымінальная справа за незаконнае перасячэньне дзяржаўнае мяжы. Аналягічная справа заведзеная і супраць Алега. «Вам просто не повезло», – канстатуе Шумейка.

Тут жа, у прысутнасьці жаўнераў з варты, старлей праводзіць мой асабісты вобыск, па выніках якога складае пратакол і дае на подпіс. Копію аддае мне. Пакідае ў кішэнях штармоўкі грыбы, нічога не йзымае і сьцелькі з абутку не вытрасае. Такі ляп!

На заканчэньне Шумейка цікавіцца, каму пазваніць – паведаміць пра маё затрыманьне. Даю тэлефоны «Беларускай Маладзёжнай», карэспандэнтам якой зьяўляюся й на якую спадзяюся, ды аднаго з калег па рок-гурту. Сваякоў непакоіць пакуль не рашаюся, хай для іх мая адсутнасьць тлумачыцца маёй вандроўкай, якая зацягнулася. А гэтыя, веру, паведамяць маім прыхільнікам. І ўзьнімецца грамадзкасьць...

З гэтага часу абвяшчаю, што далейшыя паказаньні буду даваць па-беларуску.

Працяг у наступным нумары

«Выключыць за рэгулярнае хуліганства...»

Менавіта такая фармулёўка запісана ў загадзе рэктара Горацкай сельгасакадэміі, якім зь ліку студэнтаў выключаныя Дзяніс Бобікаў і Анатоль Брыцін.

Вызначэньне «рэгулярна» мае тут толькі тую праўду, што ўвага да гэтых хлопцаў з боку рэктарата сапраўды была пастаяннай ад часу, калі юнакі сталіся сябрамі Задзіночаньня беларускіх студэнтаў. Непалітычная грамадзкая арганізацыя аб'ядноўвае студэнтаў, якія ставяць сваёй мэтай самакіраваньне, культурнае разьвіцьцё на грунце нацыянальных традыцыяў і незалежнасьці краіны. Такая арганізацыя ў сьценах акадэміі, мякка кажучы, не віталася. Ды ящчэ хлопцы пачалі выдаваць сваю газэту «Акадэмічная пуня», дзе ў звычайным для студэнцкага жыцьця стылі жартавалі зь сябе й дарослых, закраналі сур'ёзныя праблемы беларускай вышэйшай школы, распавядалі пра гісторыю роднага краю. Пільны рэктарат, ідэалягічныя назіральнікі з адпаведных раённых органаў неаднойчы праводзілі з хлопцамі «выхаваўчыя» гутаркі кшталту: дзе вы ўзялі грошы на газэту, кідайце гэтую справу, вашае выданьне акрэсьліваецца як антыпрэзыдэнцкае... Але хлопцы працягвалі выдаваць газэту. Яна набывала ўсё большую папулярнасьць, яе чыталі студэнты, выкладчыкі і... выхаваўчы прарэктар Неўдах.

На пачатку студзеня хлопцаў затрымалі міліцыянты. На сваю бяду, Анатоль і Дзяніс спрычыніліся да вулічнага канфлікту на баку справядлівасьці. Былі дастаўленыя ў пастарунак («разберомся!»), адкуль пра затрымку студэнтаў паведамілі ў рэктарат.

Такога шанцу спадар Неўдах упусьціць проста ня мог. Кола хутка закруцілася. Спробы сьведкаў вулічнага канфлікта давесьці невінаватасьць хлопцаў, якія «ня лезлі, а наадварот – заступіліся», прыезд у Горкі прадстаўнікоў сталічнага ЗБС, пацьверджаньне выдатнай вучобы і прыстойнасьці паводзінаў Анатоля і Дзяніса з боку калегаў і выкладчыкаў – нічога плёну ня мела. Лёс іх быў прадвызначаны. Мала хто ў Горках сумняецца накошт таго, у якіх кабінэтах насамрэч вырашаўся гэты лёс. (Падчас разьбіральніцтва канфлікту ў акадэміі неаднаразова сустракалі ейнага куратара зь мясцовага КГБ).

Што цяпер? Хлопцы-ж толькі ящчэ пачыналі вучобу...

Дзяніс НОВІКАЎ

Чаму зьнікаюць харчовыя прадукты

Асноўная прычына дэфіцыту харчовых прадуктаў вядомая: падзеньне вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы. Нават улады вымушаныя прызнаць гэты факт, прытым, што яны намагаюцца не заўважаць сутнасьці такога стану. Аднак нашмат менш вядомая ящчэ адна прычына зьнікненьня харчоў з паліцаў крамаў. Пра яе ўжо зусім нічога не гавораць афіцыйная прапаганда, балазе гэткае прызнаньне выявіла б відавочную крывадушнасьць і некампэтэнтнасьць улады. Я кажу пра масавы «законны» вываз прадуктаў у Расею ў якасьці аплаты запазычанасьці за энэрганосьбіты.

Гэты вываз распачаўся ў верасьні 1998 г., калі ў Расеі выбухнуў фінансовы крызыс. Штосуткі мяжу ў раёне Оршы (там асноўны паток аўтатранспарта) на расейскі бок праходзяць прыкладна 250 магутных 20-тонных грузавікоў, зь якіх больш паловы – гэта машыны зь беларускімі нумарамі. Як правіла, трэцяя частка зь іх вязе харчовыя тавары беларускай вытворчасьці. Гэта прыкладна 1.000 тон у суткі. Статыстыка, якая ёсьць у аўтара гэтых радкоў, сьведчыць, што за 5 месяцаў мінулага года (верасень-студзень) было вывезена амаль 150.000 тон мяса-малочнай прадукцыі, коштам якой была аплочана «газавая» запазычанасьць на суму 150 мільёнаў даляраў. Такім чынам была вернутая прыкладна палова запазычанай сумы (а ёсьць-жа ящчэ запазычанасьць за нафту й электраэнэргію). Як тут быць? Улада ведае толькі адзін адказ: гнаць і гнаць у Расею беларускія харчы й тавары. Заганнасьць такой «эканомікі» відавочная! Між тым даступнай і дакладнай інфармацыі пра вываз нашых тавараў няма. Праблема адкрыта не абмяркоўваецца ў грамадзтве. Наадварот, афіцыйныя СМІ і тэлебачаньне пастаянна паведамляюць аб «посьпехах на фронце змаганьня з незаконным вывазам прадуктаў». Напрыклад, рэгіянальны тэлеканал напачатку лютага ўзьнёсла паведаміў аб тым, што Крычаўскі аддзел міліцыі прызнаны лепшым у краіне па выкананьні прэзыдэнцкага Ўказа па барацьбе з «пресечением» незаконнага вываза прадуктаў харчаваньня. Паведамляецца, што высілкамі міліцыянтаў, дарэчы, адцягнутых ад выкананьня сваіх абавязкаў па ахове грамадзкага парадку, за тыдзень было канфіскавана ў грамадзянаў «незаконных» тавараў на суму... 30 мільёнаў рублёў (прыкладна 100 даляраў). Дзяржава за суткі спакойна вывозіць такіх тавараў на 1 мільён даляраў. На чыю карысьць параўнаньне? Хто-ж вінаваты ў тым, што ў крамах няма прадуктаў? Адказ, як мне падаецца, відавочны.

Уладзімер ШТУКАР,
дацэнт Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута

НАШ ГОРАД У ГІСТОРЫІ

З кім дзяліўся Магілёў сваёй назвай (артыкул сёмы)

Магілёўскія скарбы

У небясьпечныя часы людзі хавалі свае грошы ў зямлі... Здараецца, што праз колькі стагодзьдзяў выпадкова ці падчас мэтанакіраваных пошукаў гэтыя багацьці знаходзяць. Такія знаходкі называюць скарбамі. На тэрыторыі Магілёва ўжо знойдзена больш дзесятка скарбаў, якія акрамя матэрыяльнай маюць вялікую гістарычна-навуковую й мастацкую каштоўнасьць. Ня ўсе яны патрапілі ў музэі і навуковыя ўстановы, большасьць апынулася ў нумізматаў. Ды й найшмат каштоўныя скарбы з Магілёву ўпрыгожваюць зараз экспазыцыі й калекцыі расейскіх установаў, якія не зьбіраюцца вярнуць іх законным нашчадкам. Вось некаторыя зьвесткі пра нашыя скарбы.

Магілёўскі грашовы скарб 1822 г.

Знойдзены непадалёк ад горада. Складаўся з 1.300 срэбраных дырхемаў Арабскага халіфату, што былі адбітыя ў гарадах Эўропы (Кардова), Каўказу, Бліжняй і Сярэдняй Азіі, Паўночнай Афрыкі. Скарб быў захаваны ў 1-й чвэрці IX ст. Яго частка знаходзіцца ў навуковых установах С.Пэтэрбургу й Масквы.

Магілёўскі грашовы скарб 1936 г.

Знойдзены ў Магілёве ў гліняным гаршку. Вядомыя 466 дукатаў (залатых) і падвойных дукатаў 2-й паловы XV- канца XVIII ст. Грошы належалі наступным дзяржавам і гарадам: Нідэрлянды, Данія, Рэч Паспалітая, Сылезія, Саксонія, Штральзунд, Брауншвэйг, Расток, Любэк, Гамбург, Кёльн, Аўстрыя, Тыроль, Чэхія, Вугоршчына, Вэнэцыя, Швайцарыя...). Гэта быў адзін з самых вялікіх скарбаў залатых манет, знойдзеных на тэрыторыі СССР. Захоўваецца ў Эрмітажы (С.Пэтэрбург).

Магілёўскі грашовы скарб 1955 г.

Знойдзены на тэрыторыі Лупалава, каля так званай Швэдзкай сьцяны. У гліняным гаршку былі 3 срэбраных пярсьцёнкі, 562 білёнавых (нізкапробнае срэбра) і срэбраныя манеты. Захаваліся 562 асобнікі: капейкі Расеі, грошы ВКЛ і Польшчы, солідзы, трохгрошавікі Рэчы Паспалітай, манеты Брандэнбургу, Прусіі, Сылезіі, Швэдзкай Прыбалтыкі. Скарб быў захаваны недзе каля 1562 г. Знаходзіцца ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музэі.

Магілёўскі грашовы скарб 1956 г.

Знойдзены ў Магілёве падчас правядзеньня зямельных работ пры пабудове вадаправода. Знаходзіўся ў мэталёвай скарбонцы. Захавалася 3.350 расейскіх срэбраных капеек часоў Васіля Шуйскага, Міхаіла Фёдаравіча, Аляксея Міхайлавіча. Быў захаваны ў 3-й чвэрці XVII ст. Захоўваецца ў фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музэя.

Ігар ПУШКІН

НАША ВЕЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сны архітэктара...

Спачатку наш родны горад падаецца прыгожым, даволі ўтульным і чыстым. Але варта прайсьціся «па гістарычных мясьцінах», як многія добрыя ўражаньні зьнікаюць. Чаму? Аб гэтым ў нашай рубрыцы шчырых маналёгаў – гутарка з ***магілёўскім Архітэктарам.***

Якім я бачу горад

Я гляджу на наш горад вачыма архітэктара. Мне відавочныя многія хібы арганізацыі нашай гарадзкой прасторы. Тым больш, што мне вядомыя пэўныя падрабязнасьці аб тым, як і што задумвалася і як і што з гэтага атрымалася... Возьмем Ленінскую. Я бачу яе такой, якою яна й ёсьць. Пры гэтым такой яна мне і мроіцца, праўда, бяз ейнага ймя. Можа таму, што вуліца збольшага захавалася такой, як была колісь задуманая. Затое там, дзе прыклалі намаганьні савецкія архітэктары, горад атрымаў дзіўныя па безгустовасьці забудовы. У нас мала свайго стылю, сваіх адметнасьцяў. Усё нібыта як у сталіцы: шырокія вуліцы, агромістыя дамы... А навошта? Чым гэта, акрамя чыноўніцкіх уяўленьняў аб саліднасьці, апраўдана? Нічым. Эўрапейская гарадзкая традыцыя, да якой безумоўна належыў Магілёў да бальшавіцкіх часоў, заключаецца ў шчыльнасьці, у рацыянальным выкарыстаньні гарадзкой зямлі. А паглядзі, што ў нас! Вось горад, потым амаль што чыстае поле. Потым зноў горад, які ня мае ніякай архітэктурнай сувязі з папярэднім. Мяне вучылі ў інстытуце, што архітэктар – гэта ня аўтар нейкай адмысловай забудовы або аднаго будынка. Ён – горадабудаўнік. Ён мусіць бачыць горад як нешта цэласнае, адзінае, ўзаемазьвязанае. Гэта месца жыцьця чалавека, а не ягонага фізычнага прытулку. Вось гэткай цэласнасьці ў Магілёве няма.

Хто будаваў наш горад

Нават мне, архітэктару, цяжка пералічыць галоўных магілёўскіх горадабудаўнікоў за апошнія 20-30 гадоў. Архітэктары ў нас мяняліся часта. Часовая пасада, часовы горад, часовыя адносіны да працы... Аднаму не было балюча зьнішчаць, хай сабе і па загаду начальства, гістарычныя забудовы. Сярод іх ня рос, роднымі іх не лічыў. Іншаму было абы зьбегчы ў сталіцу. Трэці проста ня меў ніякага таленту. І ўсе былі бязпраўныя, голасу свайго ня мелі, да іх ніхто не зьбіраўся прыслухоўвацца. Толькі, бадай, Сьвінарэнку з гэтым крыху пашанцавала, усё-ж быў ён, адначасова з пасадай галоўнага архітэктара, і намесьнікам старшыні гарвыканкаму. Пры ім, ды яшчэ пры Юркаўцу быў распрацаваны даволі ўдалы праект рэстаўрацыі «Старога горада», прыватнай забудовы берагу Дубравенкі. Але ўсё засталося на паперы па звычайнай нашай прычыне: адсутнасьці грошай.

Ці магчымыя добрыя зьмены

Цяжка сказаць пра гэта не таму, што няма добрых архітэктараў, або згубленая надзея на пэрспэктыву. Палохае тое, што ня бачна добрых зьменаў у культурным і асьветніцкім узроўні начальства. Яно не мяняе сваіх адносінаў да архітэктараў (днямі, як вядома, пазбаўлены пасады чарговы галоўны архітэктар Магілёва, чацьверты за тры гады) і да архітэктуры ўвогуле. Гэта на Захадзе ніякі мэр ня можа камандаваць горадабудаўніком, бо ня мэр, а якраз зодчы адказвае перад сучасьнікамі і нашчадкамі за горад. У нас, выпадкова патрапіўшы ў начальства, людзі ўжо назаўтра маюць права кіраваць напрамую ўсім, што «курыруюць». Ад таго настрой многіх спэцыялістаў, ды яшчэ пры бягучым эканамічным стане, скіраваны на тое, каб «ня лезьці ў бутэльку», а зарабляць грошы, не забіваючы сабе галаву рознымі «пражэктамі». Тым больш, што на практыцы ў нас атрымліваецца так: адны плянуюць, іншыя будуюць. Пра якую творчую зацікаўленасьць можа тут ісьці гаворка... Не бачна шчыраваньня дзеля прыгажосьці горада ў яго жыхароў. Паглядзіце, што творыцца ў так званым прыватным сэктары, дзе кожны– сам сабе архітэктар. На што падобныя гаражныя забудовы? Ці можна назваць прывабным аздабленьнем горада вонкавую рэкляму? Спакойна ставяцца людзі да дзікунскіх па нашаму часу, даўно згубіўшых сэнс і выгляд «ідэалягічных» плякатаў, шчытоў, заклікаў і г.д. Зразумела, што архітэктары – першыя адказныя асобы за непрыгажосьць, запусьценьне й безгустовасьць. Аднак-жа ўсе гараджане маюць права свайго ўплыву на тое, што ёсьць захаваньнем даўніны, прывабнасьці, прыгажосьці, не гаворачы пра элемэнтарную культуру, санітарыю й чысьціню. Ніхто, акрамя нас саміх, ня зробіць горад утульным, адметным. Ніхто ня верне яму колішнюю вядомасьць аднаго з прыгажэйшых гарадоў Беларусі, пакуль усе мы не спахапімся. Часу мала. Гарады старэюць і, бывае, паміраюць, як і людзі. Не спазьніцца б нам.

Запісаў Сымон ГЛАЗШТЭЙН

НАШ РОДНЫ КУТ. ДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ

25 лютага

1706 год. Праз Магілёў прайшлі войскі ВКЛ на чале з Агінскім.

1807 год. У Магілёве быў вялікі гром і маланка. Гэта ў зімовы час!

1917 год. Расейскі імпэратар Мікалай II на палове на трэцюю дня пабываў у Магілёўскім брацкім манастыры. Затым зьдзейсьніў прагулку на аўто па шашы на Оршу.

26 лютага

1918 год. У Магілёве зьліквідаваная Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

27 лютага

1918 год. У Магілёве да расстрэлу прыгавораны ксёндз гарадзкога катэдральнага касьцёлу Святаполк-Мірскі. Губэрнскі ВРК загадаў працоўным чыгункі (сярод якіх было шмат палякаў) здаць зброю. У той-жа дзень ВРК выдаў загад аб зборы з уладальнікаў прадпрыемстваў адначасовага падатку ў памеры 5.000 рублёў.

28 лютага

1918 год. На скрыжаваньні Аршанскай і Гомельскай шашы, у раёне сучаснага мясакамбіната, быў расстраляны ксёндз Святаполк-Мірскі. У гэты-ж дзень прадстаўнікі губвыканкама і мясцовай бальшавіцкай арганізацыі перад наступам польскага войска паспешна збеглі з гораду, прыхапіўшы грошы й каштоўнасьці.

1 сакавіка

1564 год. З Масквы рэлігійнымі цемрашаламі былі выдаленыя выбітныя беларускія друкары Пётар Мсьціславец й Іван Фёдараў (Федаровіч).

1581 год. Утвораны галоўны трыбунал – вышэйшы судовы апэляцыйны орган ВКЛ. У ім нярэдка разьбіраліся справы магілёўцаў.

1881 год. Ураджэнец Магілёўшчыны Ігнат Грынявіцкі зьдзейсьніў замах на расейскага імпэратара Аляксандра II.

2 сакавіка

1991 год. У Менску распачаў працу Ўстаноўчы Зьезд БСДГ. У ім бралі ўдзел дэлегаты з Магілёву й вобласьці.

3 сакавіка

1585 год. Кароль Стэфан Баторы падтрымаў жыхароў Магілёва ў іх жаданьні не плаціць грошы на ўтрыманьне замкавых пушкароў, а мець сваіх. Такім чынам у горадзе зьявілася свая гарадзкая артылерыя.

1633 год. Кароль Уладзіслаў IV выдаў магілёўскаму брацтву прывілей на пабудову Багаяўленскай царквы і ўтварэньне мужчынскага манастыра пры ёй, а таксама на адкрыцьцё народнага вучылішча і друкарні, дзе выдаваліся кнігі на беларускай, польскай, грэцкай і лацінскай мовах.

1917 год. У Магілёве была створаная «аб'яднанка»: арганізацыя РСДРП, у якую ўвайшлі бальшавікі, меншавікі і бундаўцы.

1918 год. З Магілёва зьбеглі апошнія кіраўнікі бальшавіцкай партыі, якія пакінулі насельніцтва горада бяз грошай і прадуктаў.

1924 год. Магілёўскі, Быхаўскі, Клімавіцкі, Рагачоўскі, Чавускі, Чэрыкаўскі паветы Гомельскае губэрні РСФСР былі вернутыя Савецкай Беларусі. Магілёў стаў цэнтрам раёна ў БССР, а затым – цэнтрам акругі.

Падрыхтавалі Аляксандар АГЕЕЎ, Ігар ПУШКІН

Вітаем цябе на волі, Аляксей!

Выйшаў на волю Аляксей Шыдлоўскі, вязень сумленьня лукашэнкаўскага рэжыму. Ён правёў у зьняволеньні агулам паўтары гады за росьпісы платоў антыпрэзыдэнцкімі й незалежніцкімі лёзунгамі.

Немагчыма не вітаць мужнасьць і стойкасьць маладога хлопца, які, па мерках рэжыму, «ня стаў на шлях выпраўленьня», а таму адседзеў поўны тэрмін. Тым больш мярзотны выгляд набывае сёньняшняя карная сыстэма РБ, якая выпусьціла сваю ахвяру «па амністыі» за тыдзень перад заканчэньнем тэрміну зьняволеньня. Вядома, што амністыя па закону можа прымяняцца да адной асобы толькі адзіны раз на 10 гадоў. Такую пастку падрыхтаваў рэжым юнаку, які не скарыўся.

Але-ж, нягледзячы ні на што, у мінулы аўторак Аляксей стаў вольным грамадзянінам Беларусі – той краіны, дзеля будучыні якой ён ахвяраваўся. Хоць, зразумела, Вольным ён стаў ужо даўно, а за кратамі толькі пацьвердзіў свой духоўны і грамадзянскі статус.

Вітаем цябе на волі, Аляксей!

Рэдакцыя «ТМ», твае магілёўскія сябры і аднадумцы

Памяць: Імгненьні й Час

З фотаархіва © ІАР.

Магілёў. 8 красавіка 1990 года. Першае агульнагарадзкое сьвята «Гуканьне вясны». Лелю-вясну нясуць сябры суполкі «Машэка» Вячаслаў Ермаловіч, Ігар Марзалюк, Алесь Сердзюкоў, Ігар Пушкін.

ЗЬДЗЕЙСЬНІЦЦА. ПРОЙДЗЕ. АДБУДЗЕЦЦА.

<u>27-28 лютага</u> **магілёўскае згуртаваньне моладзі «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу»** пры фундацыі моладзевага цэнтру «Ратуша» плянуе адсьвяткаваць «Масьленіцу» – старажытнае беларускае сьвята. На імпрэзу запрошаныя сябры гомельскага аб'яднаньня «Талака», сьветлагорскага цэнтра «Крэсіва», а таксама вядомы беларускі бард Андрэй Мельнікаў. Зразумела, у імпрэзе возьмуць удзел магілёўскія моладзевыя арганізацыі.

<u>Напрыканцы тыдня</u> калегія абласнога ўпраўленьня культуры абмяркуе *ўдзел сваіх установаў і калектываў у маючых адбыцца мясцовых выбарах. Мяркуецца на ўвазе рэалізацыя ўстаноўкі на масавы ўдзел грамадзянаў у выбарах, які мяркуецца забясьпечыць ня толькі наладжваньнем на выбарчых участках гандлю дэфіцытамі, але і прапанаваньнем насельніцтву «культурнай праграмы».*

<u>У першых чыслах сакавіка</u> мае быць скліканая Рабочая група абласной асамблеі няўрадавых арганізацый. *На паседжаньні будуць вырашаныя арганізацыйныя пытаньні ўзаемных дачыненьняў грамадзкіх арганізацый, якія выказалі летась і напачатку бягучага года намер да большага адзінства ў дзеяньнях, рабочых кантактах і кансультацыях. Рабочая група таксама падвядзе першыя вынікі правадзімай уладамі перарэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў.*

<u>Зь першых дзён сакавіка</u> Свабодныя прафсаюзы абласнога цэнтра прыступяць да збору подпісаў *у працоўных калектывах прадпрыемстваў пад заявай у гарвыканкам аб дазволе правесьці масавую акцыю недаверу эканамічнай палітыцы ўрада. Адметнасьць намеру ў тым, што прафсаюзы хочуць правесьці мерапрыемства ў цэнтры горада, а не ў «рэзервацыі» каля стадыёна завода штучнага валакна, як на гэтым заўсёды настойвае выканкам.*

<u>2 сакавіка</u> – чарговы Дзень без чужога слова. *Кожны беларус мае магчымасьць падтрымаць акцыю газэты «Наша Ніва», калі будзе ў гэты дзень гаварыць, чытаць, пісаць і слухаць толькі па-беларуску.*

Кулак слабейшы за сілу духа

СПОВЕДЗЬ

З выкладчыкам катэдры спартовых адзінаборстваў Беларускае Акадэміі фізычнага выхаваньня Міхасём Качарам я пазнаёміўся пяць год таму. Яшчэ тады гэты, як мне здавалася, рэпрэзэнтант «неінтэлектуальнае» прафэсіі ўразіў мяне сваім валоданьнем беларускае мовы, абазнанасьцю ў нашай гісторыі, а галоўнае, поўнай адсутнасьцю пачуцьця свае фізычнае перавагі над астатнімі. Потым я зразумеў, што апошняе й мусіць быць галоўнай якасьцю сапраўднага байца. Час разьвёў нас па розных гарадох, але падчас нашае апошняе сустрэчы я адчуў, як філязофія ваяра дзіўным чынам у натуры Міхася нітуецца зь філязофіяй творцы. Шлях да свае прафэсіі ў яго пачаўся з усьведамленьня патрэбы быць здольным абараніць сябе ад гвалту, а потым прыйшло разуменьне неабходнасьці мець для гэтага трывалы падмурак у душы.

– *<u>Міхась, што ты ўкладаеш ў галовы й сэрцы сваіх маладых навучэнцаў, каб яны былі не падлеглыя гвалту датычна іншае, больш слабое асобы?</u>*

– Мая фізязофія базуецца на хрысьціянскіх каштоўнасьцях. Я лічу, што 12 запаветаў ёсьць абсалютна жыцьцяздольнымі. Яны павінныя йснаваць у грамадзтве й імі павінны карыстацца людзі. Але-ж я таксама лічу, што дабрыня мусіць быць моцнай, каб мець магчымасьць абараніць сябе. Таму я даводжу сваім навучэнцам, што ў жыцьці яны павінныя быць байцамі й разам з тым, калі таго запатрабуе сытуацыя, быць гатовымі абараніць любога, хто будзе мець у тым патрэбу, але нікопі ня быць злымі. Я лічу, што агрэсія супраць агрэсара ёсьць абсалютна несупярэчная Боскім накірункам. У выніку агрэсар мусіць атрымаць адказ, але ты ня мусіш мець да яго злобы.

– *<u>Які моц, на твой погляд, мусіць пераважаць у чалавеку: фізычны альбо духоўны?</u>*

– Для мяне ў ідэале – раўнавага. Чалавек можа прыйсьці да выхаваньня свайго розуму праз заняткі баявымі майстэрствамі й наадварот.

– *<u>Многія прагнуць хуткага дасягненьня фізычнае дасканаласьці. А калі, як ім здаецца, яны гэтае дасканаласьці дасягнулі, у некаторых нараджаецца пачуцьцё свае перавагі над астатнімі, а праз гэта ўзьнікае спакуса пераканаць у сваёй перавазе праз шкоду бліжняму. Як не падпасьці гэтай хваробе?</u>*

– Тыя, хто лічыць, што хутка можа дасягнуць фізычнае дасканаласьці, глыбока памыляюцца. Заняткі спортам дзеля самаразьвіцьця мусяць быць зьнітаваныя з ладам жыцьця. Пачаўшы займацца, у дадзеным выпадку, рукапашным боем, чалавек павінен рыхтавацца да вельмі цяжкога шляху. Што тычыцца другое часткі твайго пытаньня, то калі ў чалавека будзе духоўная база, пытаньне так, як ты яго задаў, стаяць ня будзе. Для кагосьці грунтам самакантролю можа стацца таяж рэлігія.

– *<u>Дарэчы, ты сам калі-небудзь страчваў над сабой кантроль?</u>*

– Нажаль, так. Аднак я цяжка перажываў свае памылкі й цягам часу зрабіў для сябе высновы.

– *<u>Што ёсьць галоўнай ідэяй баявых адзінаборстваў?</u>*

– У нас ёсьць мянокліч: «Розум мацнейшы за меч». Баявыя адзінаборствы даюць трывалы грунт для самааналізу. Праходзячы праз паядынак, чалавек выпрабоўвае сябе. Атрымаць перамогу ў жорсткім баі й пры гэтым не жадаць суперніку аніякага зла – гэта ўчынак сапраўднага мужчыны.

Алесь ДАЙНЕКА

Звычайная, звыклая, пастаянная вулічная сцэнка... Адныя абыякава праходзяць міма, іншыя спачувальна ўздыхаюць, трэція адгукаюцца на чужую бяду падаяньнем. А больш, акрамя добрых людзей, дапамагчы нашым кволым і хворым няма каму...

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі

<u>Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй «КОЛА СЯБРОЎ».</u>

Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.

Газэта выходзіць штотацьвер.

<u>АДРАС РЭДАКЦЫІ</u>:

212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

<u>Тэлефон</u>: 31-04-15,

<u>Тэл./факс</u>: 22-97-82,

<u>E-mail</u>: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 8. Наклад 500 асобнікаў.